Пашыраная „АКТАВА” ☞ 5

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Драўлянае будаўніцтва ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 31 (2829) Год LV | Беласток, 2 жніўня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Ілона КАРПЮК

Які перапіс? Каму перапіс?

Да пачатку перапісу насельніцтва ў 2011 годзе засталося толькі восем месяцаў. Гэты час павінен быць прызначаны на распрацоўку прамоцыі гэтай важнай падзеі, таму старшыня Галоўнай статыстычнай установы паклікаў на сустрэчу ў Варшаву тых, для якіх прамоцыя, актыўны і свядомы ўдзел у перапісе мае вырашальнае значэнне на будучыню, запрасіў да сябе прадстаўнікоў арганізацый і сродкаў масавай інфармацыі нацыянальных меншасцей у Польшчы. Аднак сустрэча мела зусім іншую праграму, чым запланавалі яе арганізатары. Можна яе назваць „сустрэчай другога пытання”.

— Галасы кашубаў пераканалі нас у патрэбе ўвядзення другога пытання, каб перапіс прадстаўляў складаныя тоеснасці, таму вырашылі выйсці насупраць, — сказаў Юзэф Аленьскі, старшыня Галоўнай статыстычнай установы.

— Прытрымліваемся патрабаванняў заканадаўства, таму вынікі, якія будзем прэзентаваць пасля перапісу, неабходныя для працы іншых устаноў, як хаця б Міністэрства ўнутраных спраў, — працягнула намеснік дырэктара Дэмаграфічнага дэпартамента ГСУ Люцына Новак.

— Наша мэта — данесці як мага найбольш аб’ектыўную інфармацыю. Мы даем прылады, а пасля толькі перадаем вынікі, — падкрэсліў прэс-сакратар старшыні ГСУ Веслаў Лагадзінскі.

Аб’ектыўнасць, халодны падыход, стандарты, прафесіяналізм. Аднак гладкія словы прадстаўнікоў ГСУ зразу разбурылі пытанні Алены Дуць-Файфер, навукоўца, прадстаўніка лэмкаў. Яе і іншых прадстаўнікоў Супольнай камісіі ўрада і нацыянальных меншасцей турбуюць чуткі (!) наконт перапісу.

— Ці другое пытанне пра нацыянальнасць ужо канчаткова сфармуляванае? Ці гэта праўда, што другое пытанне не будзе выкарыстанае ў падвядзенні вынікаў перапісу? Ці пасля перапісу можа знікнуць або ўзнікнуць новая меншасць у Польшчы? Ці слова „ідэнтыфікацыя” не занадта складанае для сярэдняга жыхара? Ці ў сувязі са статыстычнай таямніцай у невялікай вёсцы перапісчыкам можа быць яе жыхар, штодзень сусед апытваных?

Спадарыні Дуць-Файфер пайшлі ў дапамогу чарговыя ўдзельнікі сустрэчы.

Лукаш Гжэндзіцкі, кашубская меншасць:

— Ці даведаемся як будзе выглядаць працэс апрацоўкі вынікаў, асабліва ў кантэксце пытанняў пра другую нацыянальнасць ды родную мову? Якое пытанне, пра родную ці хатнюю мову, будзе вырашаць аб статусе рэгіянальнай мовы як гэта ёсць у выпадку кашубаў? Ці ў гмінах, дзе ўведзена дапаможная мова, можна будзе на ёй перапісвацца?

2011 перапіс насельніцтва

Такі састаў пытанняў выклікаў лавіну дыскусіі, тэмпература якой была значна вышэй 35 градусаў за акном. Наогул спакойныя асобы чырванелі ад расчаравання ці злосці ад недаразуменняў.

— Усведамляю сабе, што кансенсусу сёння не будзе, — сказала дырэктар Новак, дэпартамэнт якой адказвае за фармулёўку пытанняў і канчатковы кшталт апытання. — Але мы не ад палітыкі. Наша задача — адлюстраваць поўную структуру грамадства, у тым ліку нацыянальна-этнічную.

— Калі нам не давяраеце і не перадаеце поўнай інфармацыі наконт перапісу, не здзіўляйцеся, што і мы вам давяраць не будзем, — пракаментаваў прадстаўнік украінцаў Пятро Тыма. — Калі пытаем, а вы не адказваеце, гэта доказ невуцтва.

Сумненні меншасцей пацвердзіў сам старшыня ГСУ Юзэф Аленьскі:

— Не бачу прычын, па якіх сябрам вашых грамадскасцей мы мелі б адмовіць права акрэсліць сябе ў больш чым адной нацыянальнай катэгорыі, але прызнаю, што да падвядзення вынікаў адказ на другое пытанне не будзе ўзяты пад увагу. Ён на тое, каб стварыць верагодны вобраз разнароднасці.

— Калі другое пытанне не мае статыстычнай вартасці, дык яно непатрэбнае, а нават прынясе нашым меншасцям вялікую шкоду, — амаль выкрычаў Гжэгаж Купрыяновіч, прадстаўнік украінцаў, які дагэтуль быў адным з прыхільнікаў увядзення гэтага пытання. — Не можам даведвацца пра так важныя справы мімаходам, — дадаў.

— Мы тут не бок у дыскусіі, — выкручваўся прэс-сакратар, — мы толькі рэалізуем загад паслоў, якія, арганізуючы перапіс, выконваюць, між іншым, волю Еўрасаюза.

— Шаноўныя! — супакойвала дырэктар Новак. — Мы не займаемся нацыянальнай палітыкай. Хочам, каб вашы асяроддзі былі задаволены, таму там, дзе пражываюць меншасці, будзем лёсаваць да прадстаўнічага апытання больш кватэр, але ўсё ж такі няма гарантыі, што трапім на караімаў, якіх сапраўды няшмат, або што трапім на расселеных па ўсёй Польшчы ўкраінцаў, — дадала мімаходам.

На пытанне пра магчымасць скарыстання дапаможнай мовай у перапісе Веслаў Лагадзінскі пачаў разгортваць тэму прамоцыі. Радасна сказаў, што будзе падрыхтаваная лістоўка на кашубскай мове, а нават на 24 мовах (у Польшчы, паводле афіцыйных даных, толькі 14 меншасцей). Удзельнікі сустрэчы не атрымалі вычарпальнага адказу на пытанне, ці частка „Б” пытання пра нацыянальнасць мае кранаць этнічную ідэнтыфікацыю ці ўсё ж такі нацыянальную, не атрымалі таксама гарантыі, што сэнс яго ўвядзення разгледзяць яшчэ раз навукоўцы. Пра перапісчыкаў даведаліся столькі, што будуць падрыхтаваныя з патрэбнай уражлівасцю на справы меншасцей.

Дагэтуль у нашых артыкулах і гутарках стараліся мы прадставіць усялякага роду меркаванні і магчымыя сцэнарыі паслядоўнасцей увядзення другога пытання пра нацыянальнасць. Сёння, пасля сустрэчы з прадстаўнікамі нацыянальнай статыстыкі, меншасці не павінны стаяць абыякава збоку. Калі так зарысаваная сітуацыя не зменіцца, застаецца нам заахвочваць беларусаў ды членаў іншых меншасцей, каб:

1. <u>стаць перапісчыкам і свядома перапісваць сваё грамадства!</u>

2. <u>не чакаць перапісчыка, толькі перапісацца па інтэрнэце!</u>

3. <u>адказаць толькі і выключна на першае пытанне адносна нацыянальнай тоеснасці!</u>

Варыянт пытання пра нацыянальнасць, над якім вялася дыскусія

1. Jaka jest Pana(i) narodowość?

(Przez narodowość należy rozumieć przynależność narodową lub etniczną — nie należy jej mylić z obywatelstwem)

1. polska	8. ormiańska
2. białoruska	9. romska
3. czeska	10. rosyjska
4. karaimska	11. słowacka
5. litewska	12. tatarska
6. łemkowska	13. ukraińska
7. niemiecka	14. żydowska

15. inna (podać jaka)

B: Jeśli identyfikuje się Pan(i) także z jakąś inną wspólnotą narodową lub etniczną niż wskazana w poprzednim pytaniu, to proszę ją określić

ЗАПРАШЭННІ

Фонд „Царкоўная музыка” ў Гайнаўцы

у супрацоўніцтве з: Белавежскім нацыянальным паркам, Белавежскім асяродкам культуры, Аддзелам ПТТК у Белавежы

запрашае на:

VIII Белавежскія мастацкія інтэграцыі „Ператоча-2010”

<u>Выступаюць калектывы:</u> польскія, беларускія, габрэйскі, цыганскі, татарскі, летувіскі, расейскі, украінскі...

06-07 жніўня 2010 г. у 19.00 гадзін Амфітэатр у Белавежы

Dofinansowano ze środków finansowych Ministerstwa Spraw Wewnętrznych i Administracji.

9 770546 196000

Серыяльчык

Хто б мог падумаць якіх пятнаццаць гадоў таму, што расійскія тэлевізійныя каналы і высокапастаўленыя расійскія палітыкі ў адзін голас і ў адзін дзень стануць крытыкаваць і знеслаўляць таго кіраўніка беларускай дзяржавы, якога самі стварылі і падтрымлівалі ўвесь гэты час.

Беларускі кіраўнік некалі так і заявіў, што пакуль яго будзе падтрымліваць Расія, яго ніхто не зможа перамагчы. І Расія падтрымлівала. Калісьці нават кінулі ўсе свае справы і папрыляталі ў Мінск, абы толькі ўратаваць беларускага прэзідэнта ад імпічменту. А зараз увогуле сцвярджаюць, што за гэты час уклалі ў беларускую эканоміку больш чым паўсотні мільярдаў долараў. Чаму і дзеля чаго ўбухалі яны сюды такія грошы, расійскія кіраўнікі не канкрэтызавалі. Але факт застаецца фактам — Расія прызнала публічна і на ўвесь свет, што гэта яна не давала правесці ў Беларусі змен і з усяе сілы падтрымлівала той беларускі рэжым, які ў Беларусі ёсць і зараз.

Значыць, Расія дэ-факта ўзяла на сябе адказнасць за тое, што ў Беларусі адбылося за гэтыя гады. Адказнасць за знішчэнне беларускай мовы, за ўтрыманне эканомікі ў савецкім антырынкавым стане, адказнасць за адсутнасць у Беларусі элементарных норм дэмакратыі, за парушэнні правоў чалавека, і іншае, іншае, іншае... Адказнасць за ўсё тое, у чым расійскія каналы і расійскія ўлады абвінавацілі свайго стаўленніка, беларускага кіраўніка, якога Расія падтрымлівала і ўтрымлівала фінансава ды дыпламатычна.

Тады паўстае пытанне: а навошта Расіі гэта трэба? Яшчэ зусім нядаўна расійскія кіраўнікі сцвярджалі, што іх беларуская сітуацыя цалкам задавальняе. І тое, што тыя беларускія апазіцыянеры, якія патрабавалі раскрыць праўду па цэлым шэрагу пытанняў даставалі дубінай у плечы ды ішлі пад суд, расійскае кіраўніцтва не зусім бянтэжыла. Не зусім хвалявала, а калі казаць больш дакладна, дык зусім не хвалявала ўсё тое, у чым зараз пачалі абвінавачваць беларускую ўладу. І не ўсю ўладу, а толькі яе кіраўніка.

Дык што змянілася? Што так знервавала расійскае кіраўніцтва? Хіба тут разборкі асабістага характару. Бо ні газ, ні нафта, ні якія іншыя матэрыяльныя каштоўнасці рускіх кіраўнікоў не цікавяць. У іх гэтага ўсяго больш чым трэба. Іх цікавіць Беларусь, якую яны збіраюцца далучыць да Расіі цалкам, або губернямі. Так заяўляў расійскі прэзідэнт. Але аказалася не ўсё так проста. Беларускае кіраўніцтва не толькі не выканала загаду пра далучэнне, але на ўвесь свет паказала прыклад непадпарадкавання, прытуліўшы ў сябе кіргізскага кіраўніка, скінутага з дапамогай Крамля. І ўвесь свет убачыў, што Расія мае значна меншыя ўплывы на былыя савецкія рэспублікі, чым гэта падаецца на першы погляд. Ды і непрызнанне Беларуссю адабраных Расіяй ад Грузіі зямель за самастойныя рэспублікі таксама не з'яўляецца прыкладам пакоры і рабскай паслухмянасці, якія расійскаму кіраўніцтву так моцна патрэбныя.

І зараз некаторыя расійскія дзеячы заявілі, што на будучых у хуткім часе прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі Расія не будзе падтрымліваць існага беларускага кіраўніка. Цікава, а каго яна тады будзе падтрымліваць? У асяродку беларускай палітычнай апазіцыі ўжо прагучала некалькі версій. Але сама Расія прозвішча так і не назвала. А чаму? Адказ тут просты — бо яго няма. Няма і не будзе. Ніхто не будзе больш прарускім, як цяперашні беларускі начальнік. Расія проста палохае беларускага кіраўніка, каб быў больш паслухмяны. А той добра ведае, што акрамя яго ў Расіі больш няма нікога. Таму і не баіцца расійскіх пагроз, бо перад выбарамі прадстаўнікі Расіі прыйдуць менавіта да яго, і менавіта на яго будуць рабіць стаўку. І газ дадуць, і нафту, і крэдыты...

А беларускай апазіцыі рана радавацца гэтаму канфлікту. І зусім не трэба спадзявацца на падтрымку Расіі, бо такія спадзевы, гэта датэрміновы пройгрыш. Падтрымка то будзе, але не для апазіцыі. А гэтую развязаную тэлевайну трэба ўспрымаць проста як чарговы, танны і кепска адрэжысераваны серыяльчык, які паказваюць выключна для таго, каб не было зусім ужо сумна.

Віктар САЗОНАЎ

Быў сімвалам надзеі

25 ліпеня мінула трыццатая гадавіна з дня смерці Уладзіміра Высоцкага. Быў ён незвычайным чалавекам — паэтам, спеваком, выдатным акцёрам. Выступіў у 24 кінафільмах, пакінуў па сабе тысячы песень, вершаў; запісаў пад два дзесяткі грампласцінак. У Савецкім Саюзе, дзе ўлады яго ігнаравалі, не было дому, у якім не слухалі б гэтага барда. Не дбаў ён пра славу, а сваім жыццём і творчасцю пярэчыў фальшу, кан'юнктурнасці, паказусе.

Уладзімір Высоцкі быў тытанам працы. У тэатры, на сцэне і эстрадзе працаваў з вялікай засяроджанасцю. Сон лічыў стратай часу і пісаў галоўным чынам ноччу. Жыў у пастаяннай напрузе. Памёр на 42-м годзе жыцця ў Маскве, калі ў сталіцы Савецкага Саюза адбываліся алімпійскія гульні. Сродкі масавай інфармацыі прамаўчалі гэтую смерць, аднак вестка пра яе разышлася маланкава. Перад домам Высоцкага збіраліся людзі, быццам на мітынг. У тэатры на Таганцы, дзе пры жыцці выступаў Высоцкі, на грамадзянскую паніхіду прыйшлі сотні тысяч паклоннікаў ягонага таленту. У народзе гаварылі, што ў Маскве былі толькі два так шматлюдныя пахаванні: Сталіна і Высоцкага. Спачыў Высоцкі дакладна пасярэдзіне Ваганькоўскіх могілак, насупраць уваходу; за гэта ўлады вызвалілі з пасады дырэктара некраполіі.

Магілу Высоцкага наведваюць мільёны ягоных паклоннікаў з усяго свету; з маёй Орлі таксама некаторыя там былі. Туды маладажоны прыносяць кветкі. Пры ягонай магіле маладыя людзі абменьваюцца адрасамі, некаторыя пакідаюць свае гітары.

Сёння Уладзімір Высоцкі нікому ўжо не перашкаджае. Пры жыцці быў ён сімвалам надзеі, апярэдзіў час, становячыся сімвалам сучаснасці.

* * *

Легенда Высоцкага жыве і ў Польшчы. Ягоныя песні спявалі польскія выканаўцы. На Беласточчыне песні ў ягоным выкананні карысталіся вялікай папулярнасцю. Я сам на працягу дваццаці гадоў збіраў усе матэрыялы пра гэтага мастака. Мне Высоцкі — перш за ўсё бард, кампазітар і паэт, а пасля акцёр тэатра і кіно. У 1970-я гады слухаў я ягоныя песні з няякасных аматарскіх запісаў. Многія запісы ягоных твораў пранікалі ў Польшчу нелегальным шляхам. У маёй роднай Орлі Высоцкага ведаюць усе людзі сярэдняга і старэйшага пакаленняў. Да нядаўна асоба барда не была чужой і малодшым жыхарам, пакуль у цэнтры мястэчка пакойны ўжо Багдан Гжыбэк вёў свой бар, з якога часта хрыплы голас Высоцкага нёс у свет ягоныя песні.

Але ў Орлі людзі слухалі песні Высоцкага не толькі ў закрытых памяшканнях, дамах. У 1980-х гадах бард быў настолькі папулярным, што работнікі на будовах ці пры рамонтах слухалі яго цэлымі днямі з магнітафонных касет, нават за півам пасля працы.

Здаралася мне слухаць песень Высоцкага ў прысутнасці пажылых вясковых людзей; падабаўся ён ім. І прызнаю, што старэйшыя людзі лепш за маладых разумелі змест песень; мы часта пыталі пра значэнне некаторых слоў...

Творы Высоцкага звышчасовыя і літаральна на кожную нагоду, нават на сумныя падзеі. Вось жа нядаўна на пахаванні архіепіскапа Мірана ў Супраслі вядомы парламентарый Міхал Камінскі ў развітальным слове прадэкламаваў з памяці фрагмент песні Уладзіміра Высоцкага: „Почему всё не так, вроде всё как всегда — то же небо — опять голубое, тот же лес, тот же воздух и та же вода, только он не вернулся из боя..."

Роберт Раджэственскі так пісаў пра Высоцкага і ягоныя песні: „Песні Уладзіміра Высоцкага — для жыцця; яны — прыяцелі чалавека. У тых песнях прысутнічае дзівосная добрая сіла. Сіла, якая дапамагае выстаяць слабым і здабыць упэўненасць разгубленым. На іншую песню можна абаперціся як на спіну. Быццам у гэтых песнях ёсць нейкая асаблівая чалавечая надзейнасць. З іх аўтарам можна пайсці куды заўгодна: у разведку, у тундру, у космас, ці нават чорту на рогі. Але галоўным зместам песень Высоцкага з'яўляецца праўда. І здаецца, што не песню спяваў ён, але праўду. Праўду крутых характараў, праўду жыццёвых абставін, праўду прадвечных чалавечых праблем, праўду болю і далікатнасці, праўду свайго часу. І ў выніку гаварыў і спяваў ён пра тое, што хацелі (і не ўмелі) сказаць і заспяваць самыя звычайныя людзі. Спяваў не толькі пра іх, але і заміж іх, ад іх імя. Таму ён быў так зразумелы людзям і так дарагі ім. Таму і называлі яны яго сваім прыяцелем і безумоўна лічылі яго сваім спеваком. Песнярамі былі іншыя. А ён быў — Высоцкім".

Міхал МІНЦЭВІЧ

Вачыма еўрапейца

Як Дважанскі з Барозу

У час адной з апошніх прэс-канферэнцый падляшскі маршалак Яраслаў Дважанскі хваліўся, што праз некалькі дзён у сталіцы Бельгіі сустрэнецца са старшынёй Еўрапейскай камісіі Жозе Мануэлем Барозу.

— Я быў запрошаны як прадстаўнік аднаго з дзесяці рэгіёнаў з розных краін Еўропы. Як адзіны буду прадстаўляць Польшчу, — сказаў тады журналістам.

Сустрэча арганізавана была з ініцыятывы Канферэнцыі перыферыйных надморскіх рэгіёнаў Еўропы, арганізацыі, удзел у якой Падляшша калісьці я, яшчэ ў „Вачах паляка", абсмейваў, бо не вельмі разумеў як маецца наша ваяводства да надморскага рэгіёна. А тут маеш! Дзякуючы ўдзельніцтву ў гэтай Канферэнцыі, маршалак Дважанскі мог пераконваць шэфа ЕК да сваіх рацый, датычных — згодна з лозунгам сустрэчы — фінансавай перспектывы ЕС на 2014-2020 гады.

Пасля з нецярплівасцю чакаў я інфармацыі аб выніках сустрэчы. А раптам пан маршалак „штосьці залатвіць" нашаму ваяводству ў размовах са старшынёй Барозу? — меў я такую надзею. Калі толькі ён вярнуўся, я ўчытваўся ў інфармацыю, змешчаную на інтэрнэтных старонках Маршалкоўскай управы, значыць, на Wrotach Podlasia. І так вось даведаўся да чаго пераконваў маршалак: „Новыя членскія краіны, між іншым Польшча, не адмаўляючыся ад патрэбы рэфармавання і мадэрнізацыі гаспадаркі, хочуць захаваць усе дабраты, вынікаючыя з палітыкі згуртаванасці (spójności), выраўноўвання дыспрапорцый і салідарнасці ў адносінах да бяднейшых". Далей: „Падляшскае ваяводства як рэгіён, перад якім стаяць вялікія задачы скарачэння дыстанцыі да больш развітых і багацейшых краін ды рэгіёнаў, моцна зацікаўленае ўтрыманнем цяпер абавязваючых прыярытэтаў. Таму маршалак Яраслаў Дважанскі ў сваім выступе перад Барозу і кіраўнікамі дзевяці рэгіёнаў Еўропы прадставіў аргументы дзеля такога фармавання будучай фінансавай перспектывы. Апрача таго маршалак Дважанскі рашуча выказаўся за ўтрыманне ў 2014-2020 гадах цяперашняй спецыяльнай Аперацыйнай праграмы: Развіццё Усходняй Польшчы". Прабаваў я дачытацца ў гэтым дакуменце, а таксама ў змешчанай пазней таксама на Wrotach Podlasia размове з маршалкам, якія ж гэта абгрунтаванні дзеля будучай еўрасаюзнай фінансавай перспектывы ён прадставіў. На жаль, не даведаўся. Затое ў размове маршалак адзначыў: „Вяртаюся з гарантыяй пана Жозе Мануэля Барозу, што, на яго думку, неабходным з'яўляецца захаванне падтрымкі для найбяднейшых рэгіёнаў, бо гэта дазволіць ім на змяншэнне адсталасці. Гэта ёсць не толькі ў іх інтарэсе, але і ўсяго Еўрасаюза, таму што запэўнівае стабільнасць і развіццё супрацоўніцтва на кантыненце. Пачуў я таксама ад кіраўніка ЕК, што вопыт з ажыццяўляннем Праграмы: Развіццё Усходняй Польшчы адназначна пазітыўны". Натрапіў я таксама на цікавы сказ наконт неабходнасці фінансавых рэформ у ЕС, а звязаных з несуразмернасцямі ў развіцці членскіх дзяржаў: „Рэформы павінны быць накіраваны на паправу канкурэнтаздольнасці тых рэгіёнаў, якім найбольш пагражаюць адмоўныя вынікі крызісу". Тут мне, як грамадзяніну Польшчы, стала прыкра, бо ж, згодна з запэўніваннямі майго ўрада, сусветны крызіс нас абмінуў і абмінае, чым ганарыўся сам прэм'ер Дональд Туск. А калі так, дык „зрэфармаваныя" еўрасаюзныя грошы ў значнай частцы будуць нас абмінаць. Ды хвала маршалку, што прывёз са сталіцы Бельгіі гарантыю, што падляшская адсталасць будзе выраўноўвацца ў найбліжэйшым дзесяцігоддзі. Адно толькі, што такія запэўніванні ўжо раней пачулі прадстаўнікі ўрада і гэта ён канчаткова з'яўляецца экзекутарам гэтых гарантый.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Гарачая „Бяседа” ў Гарадку

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У суботу на адвячорку ва ўрочышча Барык у Кнышынскай пушчы пад Гарадком, яшчэ неастылае пасля няпоўны тыдзень раней адгучаўшага „Басовішча”, пачалі ісці новыя тлумы. 24 ліпеня, у той самы час, на Беласточчыне адбывалася каля дзесятка розных забаўляльна-летніх мерапрыемстваў, таксама і міжнародных (м.інш. Падляшская актава культур у Беластоку), але гэта не зашкодзіла багацтвю прапаноў для гледачоў, а і іх было не менш чым на „Басовішчы”. Не змаглі толькі даехаць заўсёдныя выступоўцы, такія як „Журавінкі” з Агароднічак — яны самі арганізавалі вялікую імпрэзу ў сваёй падбеластоцкай вёсцы Супрасльскай гміны і шкадавалі, што ў іх не выступяць гарадоцкія „Хутар”, „Асенні ліст”, „Расспяваны Гарадок” ды залучанскія „Каліна” з „Калінкай”. Гміны сябруюць калектывамі, дамамі культуры — і вось у гэты вечар першы раз на „Сяброўскую бяседу” запрошаны былі „Незабудкі” з Нурца-Станцыі. Жанчыны ў гадах з маладога калектыву бойка справіліся з хваляваннем перад публікай яшчэ большай чым на фестывалі беларускай песні ды заваявалі яшчэ і другі галоўны прыз „Сяброўскай бяседы”: іхні каравай, які спяклі на конкурс, здабыў першае месца!

З традыцыі „Сяброўскай бяседы”, якая ўжо адзінаццаты раз сцягнула тысячы аматараў свойскай гульні, застаўся вось кулінарны конкурс, пячэнне на стрыжні парасяці (у гэты раз пяклі здаравенную кульшу) ды феерверкі. Цяпер не было амаль штохвілінных выбухаў і роспырскаў іскраў пад прымацкі прыпеў *Гэй, сяброўская бяседа, гуляць трэба, трэба нам!*; адмысловы фестываль феерверкаў роўна апоўначы ўскалыхнуў наваколле, напачатку яшчэ крыху пастраляўшы, падыміўшы і пашыпеўшы пры першым выступе. Пачатак імпрэзы, як належыць мерапрыемству, падтрымліванаму самім МУСіА ды Маршалкоўскай управай, адкрылі ўлады Гарадоцкай гміны — войт Веслаў Кулеша і старшыня Гміннай рады Вечаслаў Госцік. Прамовіў таксама віцэ-маршалак Мечыслаў Башко (у гэты раз не па-беларуску) — адчуваў ён тут сябе свойска, успамінаючы сваю старонку (Талькоўшчына Шудзялаўскай гміны) і тое, што непадалёк Гарадка касіў свой луг.

„Бяседа” сапраўды была сяброўская — апрача гарадоцкіх калектываў выступілі скарбы іншых суседніх (і не толькі) гмін: „Чыжавяне”, арлянскія „Арляне” і „Вэрвачкі”, бельскія „Васілёчкі”, „Жэмэрва” і „Маланка”, гайнаўскае „Рэха пушчы”, нурэцкія „Незабудкі”, „Зараніца”. Крыху памяняўся спісак выступоўцаў (часам не верыць яму, як у мінулым годзе, калі на ім апынулася „Крыніца”; як не хапае яе тут!). „Зараніца” — яна з Крынак; у спіску спявачкі яшчэ як „Сугучча”. Ася Чабан, Алена Пухальская, Моніка Дзядэль і Сільвія Дзядэль, Кася Дмітрук-Алексяюк (спявала сёння на іншым мерапрыемстве) далей падтрымліваюць сваім талентам Крынкі, другая частка „Сугучча” — гродзенская — загуляла ў „зоркі” і выступіла з праграмай па правілах сцэнарыя беларускага народнага гуляння вывучанага ва Універсітэце культуры — „з роднай Гародні, ад бацькі Нёмана”. Міла гучалі беларускія песні і прыгаворкі, бо было „людзей тут прэз край, хоць лыжкай мяшай”. З проста неверагодным тэмпераментам (звычайная справа) выступіў Лявон Вольскі з „Крамбамбуляй”. Прагучалі беларускія і ўкраінскія са свойскім маўленнем песні ў выкананні „Сказкі” і „Вясны” („Вясна” іграла яшчэ да раніцы для танцаў), хораша выступілі „Белыя крукі” з Круклянак — маладыя ўкраінцы. Пасля феерверкаў грымнула ольштынская „Горпына”. І рускія былі — з Інстэрбурга (асацыяваўся гэты горад пажылым слухачам, якія моладдзю былі ў час вайны), іначай Чарняхоўска — вадзілі „Карагод”.

Віктар Шалкевіч (з мікрафонам) як вядучы зачараваў публіку

З неверагодным тэмпераментам выступіў Лявон Вольскі з „Крамбамбуляй”

Усё спраўна, весела, з гумарам вёў Віктар Шалкевіч, падперазаны двума ручнікамі — адным беларускім, другім — бяседніцкім, у Лёнікавы пеўнікі. Ён жа сват, разварушыў публіку да немагчымасці — нават цалавалася! Публіцы спадабаўся ён найлепш з вядучых да гэтай пары. Праўда, калі прыйшла яго чарга канцэрта, некаторыя амаль не сагналі барда са сцэны: „Давай што да танца!”. Так што было што для духа і цела для маладых і старэйшых: было што паесці ды папіць, паслухаць і набыць друкаванае беларускае слова і касеты з музыкай. А танцоры ўшчэнт датапталі мураўку, недатанцаваную на рок-канцэртах.

Гарадок рыхтуецца да змен: будзе ў Барыку стаяць новая сцэна. Атачэнне — як выраслі за апошнія дваццаць гадоў гэтыя карабельныя сосны наўкола! — амаль нязменнае. І гэта прыцягвае публіку — багатая гасціна ў сваім краявідзе, сярод сваіх людзей. Таксама і гасцей: з улады і з кандыдатаў у яе. Сярод гасцей і такія, як Юрка Стэфановіч, для якіх такая імпрэза з'яўляецца нагодай для горкіх роздумаў пра мову, культуру і стан душы тутэйшага чалавека.

Янка Карповіч

Зелле на павароце

Ужо неаднойчы пісаў я ў „Ніву" пра павятовую дарогу ў Нарваўскай гміне, калі едучы з Беластока ў Трасцянку паварочваем улева праз вёску Бялкі, Агароднікі і Іванкі-Рагазы. Спалучаецца яна каля рэчкі Рудня з ваяводскай дарогай у напрамку Нарвы. Гэтую дарогу з Трасцянкі ў Бялкі ў тры кіламетры асфальтавалі 4 гады з адным годам перапынку. На асфальтаваным адрэзку дарогі час ад часу абкосяць абочыны з пустазелля. Далейшы адрэзак дарогі — жві-

раваны. Гэтым адрэзкам з Бялкоў, Агароднікаў ад вёскі Іванкі-Рагазы не цікавяцца павятовыя дарожныя ўлады ў Гайнаўцы; далей ад вёскі Іванкі-Рагазы асфальтавае палатно да ваяводскай дарогі пакладзена яшчэ пры „камуне". І на гэтым адрэзку жвіроўкі буяюць пустазелле і лаза, якія на паваротах пагражаюць небяспекай, таму што з-за іх кепска відаць шафёрам. Высылаю здымак, які зрабіў Войтак з Міхалова, каля ўказальніка „Бялкі", дзе ў пустазеллі мяне ледзь відаць! Прачніцеся, павятовыя чыноўнікі дарожнай службы! Бо калі здарыцца бяда на гэтым адрэзку, дык каго тады судзіць за недагляд?

Традыцыя не загінула

Вёска Бялкі належыць да праваслаўнай парафіі ў Трасцянцы Нарваўскай гміны. Урачыста адзначаем Градавую сераду, сёлета — 15 чэрвеня. Мой бацька пражыў 93 гады, а адышоў з гэтага свету 25 гадоў таму, няхай яму зямля пухам будзе. Расказваў, што чуў ад сваіх бацькоў, быўшы юнаком, як у той дзень аднойчы надышлі чорныя хмары. Стала зусім цёмна, загрымела і пайшоў лівень з градам. Цэрквы — у Патоцы, Тапалянах, Пяценцы, Заблудаве, Пухлах, Трасцянцы і Нарве — сталі званіць ва ўсе званы, каб адагнаць хмары. Яны сваімі званамі так скалацілі хмары, што ўсе скруціліся ў адну ў ваколіцы вёскі Бялкі. Так у нас тады пабіла засевы збожжа ды бульбу, што не было чаго збіраць на полі. З таго часу вёска Бялкі асабліва святкуе Градавую сераду; збіраем грошы і заказваем абедню ў трасцяніцкай царкве. Пільнуе традыцыю асабліва жыхарка Бялок Люба Сценанюк.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Культура на сходах музея

У час вялікай спёкі гайнавяне, прыезджыя і турысты, сярод якіх былі студэнты і выкладчыкі Міжнароднай летняй школы ў Гайнаўцы, сабраліся перад Музеем і асродкам беларускай культуры, каб паглядзець выступы нашых калектываў, а пры нагодзе пазнаёміцца з працай на прадзільных і ткацкіх прыладах. Усё гэта адбывалася 18 ліпеня ў рамках праекта „Культура на сходах музея". Хаця мерапрыемства было названае „Нядзеляй ільняных кашуль", то можна было паглядзець сучаснае рукадзелле, вытокі якога сягаюць далёкага мінулага.

У час беларускага фэсту найбольш пашанцавала спевакам, якія рыхтаваліся да выступаў у халодных музейных памяшканнях і паказваліся перад публікай на музейных сходах у цяньку. Шматлікая публіка сабралася на гарачым сонцы і старэйшыя асобы пачалі перасоўваць доўгія лаўкі бліжэй выступаючых, у зацененыя месцы, бо тэмпература даходзіла да 33 градусаў. Паколькі музей знаходзіцца ў цэнтры горада, частка публікі адыходзіла з мерапрыемства, а іх месца займалі новыя асобы. Некаторыя кружыліся побач паказаў даўніх заняткаў ды сучаснага рукадзелля і крамы з беларускімі кніжкамі, керамікай і макаткамі. Проста некаторыя жыхары Гайнаўшчыны аддалі свае макаткі для продажу і яны красаваліся побач музейнай сцяны. Першымі з беларускім рэпертуарам выступілі на сходах былыя выпускнікі Гайнаўскага белліцэя Павел Невядомскі, Ян Андраюк і Данель Сакоўскі, якія свой гурт назвалі „Metro Dance", за імі — вядомы не толькі на Гайнаўшчыне „Art Pronar" з Нарвы з салістам Янам Снарскім. Іаланта Антоўская паказвала як узнікае габелен, а Анна Леанюк вучыла выконваць паясы-падпяразкі, г.зв. „крайкі".

— Музейныя кросны ўжо састарэліся. У мяне ў клуні стаяць акуратныя кросны, якія сорак гадоў назад зрабіў мне бацька. Я магла б іх прывезці сюды і ткаць на іх намнога хутчэй і спраўней, чым раблю гэта цяпер. Праўда, і ў іх сноўніцу шведы [караеды — аўт.] крыху паелі, бо была зроблена з сасны, але ўсё астатняе ў кроснах было з ясеню, то і засталося цэлым. Аднак гледзячы з другога боку, то я ўжо 20 гадоў не ткала і трэба было б крыху паткаць, каб працаваць большым тэмпам. Мая мама многа ільнянога палатна выткала і іншых вырабаў, а я ў асноўным плахты ў пераборы і палавікі ткала. Толькі 10 губ, значыць 40 метраў палавікоў у 4 нічаніцы выткала, — заявіла Марыя Пракапюк, ураджэнка Новага Корніна, якая зараз жыве на акраіне Гайнаўкі, а канкрэтна ў леснічоўцы на тэрыторыі Белавежскай пушчы. Цікава, што спачатку каля Марыі Пракапюк пачалі збірацца старэйшыя жанчыны, якія раней самі ткалі на кроснах і пачалі абменьвацца ткацкім вопытам. Пасля тканнем пачалі цікавіцца маладыя, якім трэба было б тлумачыць увесь працэс работы практычна ад асноў. Аднак Марыя Пракапюк была занята прэзентацыяй ткання, а таксама прадзення на калаўротку і адказвала толькі на пытанні. У тым часе паказвала яшчэ што робіцца на іншых прыладах, якія прывезла са свайго панадворка.

— Калаўротак ляжаў на вышках. Не паспела я яго яшчэ змазаць, то не ходзіць як трэба. Прывезла таксама свае матавіла і чаўнок, каб паказваць, што на іх рабілася, а цэўкі сама ўжо цяпер рабіла, — дабавіла спадарыня Марыя.

Калі быў заказаны выступ калектыву „Сявенька" з Беларускага музея, публіка была здзіўлена, убачыўшы новыя твары і новы характар калектыву. Раней выступалі ў ім у галоўным белгімназісты, вучні Гімназіі № 3 з Гайнаўкі і белліцэісткі з пастаноўкай аўтэнтычнага вяселля і з аўтэнтычным неапрацаваным фальклорам. Зараз у „Сявеньцы" з гумарыстычнымі сцэнкамі і беларускай песняй выступілі белліцэісты, якімі з вясны апякуецца настаўнік беларускай мовы і музейны дзеяч Ян Карчэўскі.

— Зараз новы склад калектыву і новая формула яго дзейнасці. Засталося толькі старое названне гурту. Мы рыхтуем жартоўныя сцэнкі, як кабарэ. Вучні ахвотныя таксама заспяваць па-беларуску. Можа будзем вяртацца і да традыцыі, але не ў такой формуле, як рабіла гэта „Сявенька" раней, — сказаў апякун калектыву Ян Карчэўскі, які ўдала вёў мерапрыемства супольна з пастаяннай вядучай музейных імпрэз Паўлінай Паўлючук. Арганізавалі яны, між іншым, конкурс на расказ пра апрацоўку ільну, у час якога перад публікай паказалася старэйшая асоба і ўдала расказвала пра працу ў мінулым.

— Калі на нашым мерапрыемстве збіраецца столькі публікі, значыць, яно патрэбнае ў нашым асяроддзі. У Гайнаўцы распазнавальным стаў ужо плакат, які спасылаецца на нашы мерапрыемствы з цыкла „Культура на музейных сходах", — заявіў выконваючы абавязкі дэрэктара Беларускага музея ў Гайнаўцы Тамаш Ціханюк. — Мы паказваем тое, што ў нас занікае, бо ў час наступных фэстаў на музейных сходах будзе прэзентавацца ганчарскае рамяство, саломапляценне і іншыя заняткі.

Са своеасаблівым спевам, які спадабаўся гайнаўскай публіцы, выступіў калектыў „Луна" з Беластока.

— Мы з 2008 года ўвесь час дзейнічаем самастойна, без інструктара і падтрымкі якой колечы арганізацыі. Аднак увесь час чакаем цікавай прапановы, — кажуць Іаанна Міранчук і Юстына Мартынюк з „Луны". — У асноўным мы выступаем з апрацаванымі фальклорнымі песнямі, якія запісалі ад нашых бацькоў і дзядоў, але ўключаем у наш рэпертуар таксама песні ў стылі фольк і іншыя творы. Апошнім часам мы выступалі на „Купаллі" ў Залуках, а ў бліжэйшы час будзем спяваць у час „Дзён Нарвы" і на фэстах у Ляўкове і Семяноўцы.

Калі на сцэну выйшаў калектыў „Dekada Bend" у адзін момант узарваўся вельмі моцны вецер і пачаў тузаць палаткі над крамамі з кніжкамі і рукадзеллем ды прадзільным і ткацкім варштатамі. Добра, што да моцнага ветру прадпрымальнік з Гайнаўкі паспеў пагрузіць у машыну свой замак для дзіцячых гульняў. Усе прадаўцы паспешліва пакавалі свой тавар у кардонкі і грузілі ў машыны або насілі ў музейныя памяшканні. Аднак частка публікі, вакалістка, двух гітарыстаў, перкусіст і акардэаніст з калектыву „Dekada Bend" не спалохаліся моцнага ветру і магчымай буры.

— Шкада, што так адмянілася надвор'е якраз у час выступу самага лепшага сённяшняга калектыву, які меў выступіць з гадзінным канцэртам, — сумаваў дырэктар Тамаш Ціханюк.

Аднак вецер паволі пачаў суцішацца і ў час мерапрыемства не адбылося нічога страшнага. Не было ні граду, ні дажджу. У асноўным малодшая публіка засталася да канца выступаў калектыву з Бельска-Падляшскага, які прэзентаваў у асноўным беларускі рэпертуар і лёгкую музыку. Чарговы фэст з цыкла „Культура на сходах музея", прысвечаны ганчарству, прадбачваецца арганізаваць у верасені, а ў жніўні музей плануе ладзіць вясковыя фэсты з цыкла „І там жывуць людзі" ў вёсках Чаромха, Койлы, Пагарэльцы і Вітава.

Калі сонца схавалася за вялікім мураваным музейным будынкам, людзі ўздыхнулі з палёгкай, бо маглі лепш засяродзіцца на слуханні беларускіх песень (на сходах выступае „Луна")

Марыя Пракапюк, ураджэнка Новага Корніна, паказвала як у мінулым ткалі на кроснах

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

ПАШЫРАНАЯ „АКТАВА”

Каля трыццаці калектываў з некалькімі сотнямі выканаўцаў з блізка дваццаці рэгіёнаў свету ўдзельнічала ў III Міжнародным фестывалі музыкі, мастацтва і фалькрору „Падляшская актава культур”. Незалежна ад таго, што імпрэза мела прэзентаваць культуру прадстаўнікоў пражываючых на Падляшшы і шырэй васьмі „законных” нацыянальнасцей пражываючых у Польшчы, сёлета яе арганізатары пашырылі формулу нават на Індыю і Непал.

„Актаву” ўжо традыцыйна пачаў пасля поўдня (23 ліпеня) у Беластоку парад усіх удзельнічаючых у ёй ансамбляў. На здзіўленне шмат каго з хацеўшых у ім удзельнічаць і згодна з інфармацыяй на плакатах і спецыяльна выдадзеных буклетах, не адбыўся ён на шляху Сенны рынак — Гарадскі пляц. У апошнюю хвіліну быў ён зменены і артысты рушылі з пляцу перад каталіцкай кафедрай. Аказалася, вось, што Сенны рынак увесь перакапаны; яго рамонт цягнецца ўжо ад даўжэйшага часу, аб чым павінны былі ўжо ведаць арганізатары; у гэтак званую лагістыку мерапрыемства ад Ваяводскага асяродка анімацыі культуры ў Беластоку ангажаваны былі дзесяткі асоб. Тым не менш, парад быў імпазантны. Спевакі, танцоры і музыкі ў казачна каляровых строях, з табліцамі, на якіх выпісаны былі назвы краін, а некаторыя з нацыянальнымі сцягамі дабіраліся да фантана пад Ратушшу. Тут рэкамендаваліся беластачанам і захопленым турыстам кароткімі мастацкімі праграмамі. Ужо тады з асаблівым хваляваннем прымалі тут м.інш. Міжшкольны чачэнскі мастацкі калектыў „Ноча” (у свабодным перакладзе „чачэн”), існуючы два гады, у склад якога ўваходзяць дзеці і моладзь чачэнскіх бежанцаў, якія ўцяклі са сваёй краіны і пасяліліся ў Беластоку. Мастацкі кіраўнік групы Зарэма Самбіева кажа:

— Хочам, каб нашы дзеці тут, на чужыне, захоўвалі традыцыйныя танцы, аснаваныя на абраднасці чачэнскай вёскі.

Пад вечар стартаваў інаўгурацыйны канцэрт фестывалю. Вітаючы са сцэны яго ўдзельнікаў і публіку падляшскі маршалак Яраслаў Дважанскі (галоўны арганізатар — ВААК — установа падлеглая Маршалкоўскай управе) гаварыў:

— Аб нашым фестывалі ўжо гучна не толькі ва ўсёй Польшчы, але і ў Еўропе, а нават па-за межамі нашага кантынента.

Яшчэ ў час папярэджваючай інаўгурацыйны канцэрт прэс-канферэнцыі маршалак тлумачыў:

— Арганізатары, запрашаючы чарговыя калектывы, пашыраючы тэрытарыяльны абсяг фестывалю, хочуць паказаць дзеянні над утрыманнем разнароднасці ў штораз больш глабалізаваным свеце. Адной з важных мэт фестывалю з'яўляецца зразуменне каштоўнасці ўласнай культуры шляхам канфрантацыі з іншымі, у духу супрацоўніцтва і талерантнасці.

Па-за сцэнай дырэктар Фестывалю, а заадно дырэктар ВААК Анджэй Дырдал адзначаў:

— Я веру, што наш фестываль будзе платформай фармавання павагі для культурных асаблівасцей і пакажа нашым гасцям каштоўнасці і красу Падляшша.

Адбор калектываў запрошаных да ўдзелу ў „Актаве” здзейсніла Міжнародная мастацкая рада. Беларускае асяроддзе прадстаўляе ў ёй Ігар Лукашук, аніматар культуры, звязаны са Звязам беларускай моладзі. Старшыня Рады этнограф Зыгмунт Цясельскі пераконваў:

— Узаемная пазіцыя ўшанавання для адрозненняў паміж нацыянальнасцямі і вернікамі розных рэлігій на тэрыторыі цяперашняга Падляшскага ваяводства абавязвала тут стагоддзямі. Не азначае гэта, што не даходзіла спарадычна да напружанасцей і канфліктаў, пераважалі, аднак, адкрытасць і рацыяналізм. Гэтыя рысы можна палічыць падляшскай традыцыяй.

У першыя тры дні фестывалю (яшчэ працягваўся, калі паказаўся гэты нумар „Нівы”) таксама ў іншых мясцовасцях Падляшша выступілі калектывы м.ін. з Краснадарскага краю і Адыгеі, Грэцыі, Украіны, Індыі, Турцыі, Харватыі, ну і з Польшчы. Падляшскіх беларусаў прадстаўляла „Калінка” з Гарадоцкай гміны. З ліку трох ансамбляў з Беларусі (апрача гродзенскіх ансамбляў „Гасцінец”, прадстаўляючага беларускі фальклор, і Польскага ансамбля песні і танца „Хабры”) у час інаўгурацыйнага канцэрта можна было захапляцца цыганскай культурай у выкананні Беларускага музычнага тэатра „Рада”, які выступіў з праграмай „Gine Roma”. Калектыў, у якім выступае пад трыццаць асоб (прыехала толькі яго частка), дзейнічае ад чатырох гадоў; ад двух гадоў мае статус дзяржаўнага музычнага тэатра. У размове з „Нівай” кіраўнік групы Ігар Суворкін, акампаніруючы на гітары, выпускнік мінскага Універсітэта культуры, сказаў:

— Называемся тэатрам, бо на нашы выступленні складваюцца музыка, песні і танцы ў драматургічным афармленні. Розніца ў цыганскай культуры ў Беларусі і, напрыклад, у Польшчы ды шырэй у розных краінах заключаецца ў тым, што там, дзе жывуць цыгане, там пераймаюць таксама мясцовую культуру, ператвараюць праз сваю энергію і прыродны цыганам спосаб эмацыянальнай перадачы. Маем у рэпертуары таксама чыста беларускія песні і танцы, а таксама казацкія.

Падляшская Актава культур з'яўляецца лаўрэатам конкурсу „Падляшская марка года” ў катэгорыі мерапрыемстваў ды апынулася як адзіная з дзвюх польскіх імпрэз рэкамендаваных Міжнароднай арганізацыяй народнага мастацтва.

Адным з яе медыйных патронаў была „Ніва”.

Супрасль прыгажэе

Яшчэ ў пачатку красавіка ў цэнтры Супраслі (Беластоцкі павет) мітусіліся бульдозеры, грузавікі і іншыя будаўнічыя машыны. Вялікі рух быў на пляцоўцы перад будынкам гарадскога кіно „Ютшэнка”. І вось на месцы дзікіх загонаў маем дарожкі-алейкі з брусчаткі, навейшае электраасвятленне (лямпы), лавачкі. Паміж сцяжынкамі пасадзілі дэкаратыўныя дрэўцы і кветкі. У цэнтральным месцы пляцоўкі пабудавалі фантан, які адначасова з'яўляецца... сонечным гадзіннікам. Запраектаваў яго мастак Рыгор Лось.

Фантан-гадзіннік дзейнічае ад 9 да 16 гадзіны. Вечарам ён падсветлены ад 20 да 23 гадзіны. Гэта атракцыён для жыхароў горада і для турыстаў. Пры фінансаванні гэтай інвестыцыі не абышлося без еўрасаюзных сродкаў.

Пройдзе яшчэ крыху часу і — ёсць такія меркаванні — будзе адноўлены будынак кіно, які мае даволі цікавую архітэктуру. А над ракою Супраслю будуюцца бульвары, амфітэатр. Горад мяняе сваё аблічча з кожным годам.

Гайнаўка летам

У красавіку гэтага года ў Гайнаўцы на гарадскіх клумбах пасадзілі больш за 5 тысяч кветак, якія зараз, летам, прыгожа цвітуць на скверыку пры гарадской управе і скрыжаваннях галоўных вуліц, між іншым, 3 Мая і Ю. Пілсудскага ды 3 Мая і С. Баторыя, а таксама ў вазонах-кветніках па вуліцы 3 Мая.

Кветкі ўпрыгожваюць таксама скрыжаванні вуліц з кругавым рухам Яна Паўла II (вуліцы 3 Мая, Варшаўская і кс. І. Верабея) ды ля макета зубраў на скрыжаванні вуліц Баторыя, а. А. Дзевятоўскага і Спартыўнай.

Сёлета на гайнаўскіх вуліцах паставілі сто новых сметніц, між іншых па вул. а. А. Дзевятоўскага і Спартыўнай.

Я і мае калегі са школы памятаем Гайнаўку сямідзесятых гадоў мінулага стагоддзя. Тады кветак у гэтым горадзе было яшчэ больш!

Нараўчанская гміна

Дрэнна, калі няма раскладаў

Аўтобусы ПКС з Беластока ў Нараўку і далей у Гайнаўку ездзяць па двух маршрутах: адзін цераз Сушчу і другі — цераз Бандары. Даўжыня маршрутаў, напрыклад, з Беластока ў Новае Ляўкова, амаль аднолькавая — 64 км. На аўтобусных прыпынках стаяць дашкі і зараз толькі ў некаторых з іх вісяць актуальныя расклады язды.

Сёлетняй вясной радны з Новага Ляўкова выступаў на сесіі Гміннай рады ў Нараўцы з прапановай, каб ПКС паклапаціўся пра расклады ў Плянце, Гарадзіску, Нараўцы і Свінароях. Войт выслаў прапанову дырэкцыі ПКС. Адтуль прыйшоў адказ, што гэта зробяць, калі прыйдзе час акцыі расклейвання раскладаў.

Зараз ужо лета ў разгары, а раскладаў як не было, так і няма. Правяраў я гэта 14 ліпеня г.г. Калі будзе тая акцыя, невядома.

Расклады, аднак, неабходныя. Дрэнна, калі іх няма! **Янка ЦЕЛУШЭЦКІ**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Сяброўства бабулі і дзікай козачкі!

Аднойчы, калі мы пайшлі да спадарыні Яўгеніі Казлоўскай, мы пачулі гісторыю пра казулю, сабаку і ката, якія спалі ў адной кучцы.

Маленькую казулю знайшоў гаспадар. Калі ён касіў траву, пабачыў звярка. „Дзе яе мама? — падумаў ён. — Ці не злякалася яна трактара і не ўцякла ў лес?"

Чалавек пашкадаваў напалоханага звярка і забраў яго дахаты. Козачку напаілі малаком, палажылі ў пакет і назвалі Басяй. Калі яна падрасла, вельмі пасябравала з гаспадыняй. Бася заўсёды хадзіла з бабуляй, ела хлеб з яе рук, прыходзіла ўначы, калі прагаладася. Няраз бабка ба-

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

чыла як козачка гуляе з сабакам і катом. Калі звяры набегаліся, клаліся разам спаць і адпачывалі. Аднойчы Бася ўцякла з панадворка. Козачкі не было тры месяцы. Людзі бачылі як хадзіла яна па вуліцы і нікога не баялася. Пасля Бася прыбегла на луг, дзе пасвіліся бабуліны каровы. Калі гаспадыня пайшла па кароў і пабачыла сваю Басю, вельмі ўцешылася. Яны ўчатырох вярнуліся на панадворак і зноў жылі разам ды сябравалі. Але дзікага звярка цягнула ў лес. Аднойчы Бася выбегла з панадворка і... ужо не вярнулася.

„Цікаўнасць", **Патрыцыя Ігнацюк**, V клас ПШ у Аўгустове

У БЕЛАРУСІ БЫВАЮ ВЕЛЬМІ ЧАСТА!

Фота Міры ЛУКШЫ

З Міхалінай Герасімюк — фатографам, дызайнерам і журналістам на Сустрэчах „Зоркі", вучаніцай Гайнаўскай беларускай гімназіі размаўляюць сустрачанскія хлопцы Аляксандр, Пятро і Куба (А-П-К).

А-П-К: — *Адкуль Твае бацькі?*

Міхаліна: — Мая мама родам з Беларусі. Яна нарадзілася ў Брэсце. А мой бацька родам з Чахоў-Арлянскіх, што на Беласточчыне.

— *Як часта бываеш у Беларусі?*

— У Беларусі я бываю вельмі часта. У мяне там бабуля. Я езджу да яе на канікулы і ўсякія святы.

— *Дзе ў Цябе лепшыя сябры?*

— Я не ведаю ці можна так нармальна параўноўваць. У мяне тут добрыя сябры, і там добрыя сябры. І з аднымі, і з другімі можна нармальна паразмаўляць.

— *Чым адрозніваюцца людзі ў Польшчы і ў Беларусі?*

— Мы жывем на Падляшшы, дзе беларуская меншасць складае большасць. У спосабе быцця людзі вельмі падобныя: усе рана падымаюцца, снедаюць, працуюць. Мне цяжка назваць розніцы.

— *Дзе жывуць Твае дзяды?*

— Дзед жыве ў Чахах-Арлянскіх, а бабуля — у Высокім каля Брэста.

— *Якая бабуля лепш гатуе?*

— Я не ведала сваёй бабулі, якая жыла ў Польшчы. Я ведаю толькі, што бабуля Тамара, мама маёй мамы, гатуе вельмі смачна.

Гутарылі **Аляксандр Адзіевіч**, V клас ПШ у Орлі; **Пётр Аўксенціюк**, I клас Белгімназіі ў Гайнаўцы, **Куба Ваўрусевіч**, IV клас ПШ № 3 у Бельску-Падляшскім.

Фота Міры ЛУКШЫ

Айцец Гаўрыіл размаўляе з нашымі журналісткамі

Добрае слова як магніт!

Калі хтосьці паедзе ў Адрынкі ва ўрочышча Кудак, у месца дзе жыве архімандрыт Гаўрыіл, дзе навокал дрэвы, вада і дзікі краявід, аж хочацца жыць.

І калі хтосьці паслухае мудрых слоў людзей, адчуе да ўсяго цікавасць і захоча сам нешта добрае зрабіць. На востраве мы спаткалі многіх паломнікаў. На пытанне чаму сюды прыехалі, людзі гаварылі:

— Памаліцца прыехалі, бо тут каля каплічак і ікон адчуваецца блаславленне, — кажа спадарыня з Храбалоў.

У Кудак людзі прыязджаюць з розных старон Польшчы. Ідучы па даўжэзнай кладцы, па-над балотамі, можна захапляцца дзікай прыродай, спевам птушак. Да прыезду, аднак, найбольш матывуе сам айцец Гаўрыіл.

— Яго энергія і добрае слова прыцягвае як магніт, — кажа Наталля Смактуновіч з Нарвы. — Я прыязджаю сюды з сям' ёй заўсёды калі тут служба.

У такіх месцах добра думаецца пра свае ўчынкі, пра сваё жыццё. Тут лягчэй зразумець што важнае, а што пустая лухта. Калі прыедзе сюды хтось стомлены перажываннямі і будзе тут шукаць дапамогі, напэўна яе знойдзе. У Кудак людзі прыязджаюць ачысціцца духова і такімі яны вяртаюцца дахаты.

„Цікаўнасць", **Уля Беразавец**, I клас гімназіі ў Нарве

Фота Мірка Здрайкоўскага

Міколка і Аляксандр Здрайкоўскія ў дарозе на Грунвальд

Нараўчанскі „Антракт”

У час візіту ў ляўкоўскую святліцу мы даведаліся пра тэатральны гурток „Антракт”. Мяне вельмі зацікавіла яго дзейнасць, таму што тэатр з’яўляецца маёй вялікай пасіяй і калі я не маю магчымасці выступаць на сцэне, тады шукаю сабе суразмоўцаў для гутаркі на гэтую тэму. Менавіта таму я і рэдакцыйныя сябры дамовіліся на сустрэчу з інструктарам і апякункай групы — спадарыняй Анэтай Снарскай. Калі ў 2007 годзе куратар і Беластоцкая камендатура паліцыі прыдумалі акцыю *Dramat i komedie pozostaw teatrowi!*, яна разам з настаўніцай Аннай Валэйшай вырашылі сабраць групу моладзі і падрыхтаваць спектакль. Такім чынам у Нараўчанскай гімназіі паўстаў тэатр. Іх тэатр — як адзначыла інструктарка — вылучаецца выхаваўчым пераказам і ставіць сабе за задачу адбіваць ахвоту моладзі ад шкодных звычак і дурных паводзін: курэння папяросаў, піцця алкаголю, боек і дурных сварак, якія вельмі частыя сярод юнакоў у гімназічным узросце. Аўтарамі сцэнарыяў з’яўляюцца самі апякункі. Яны штодзень працуюць у школе псіхолагам і педагогам і добра ведаюць праблемы сучаснай моладзі. У час размовы са спадарыняй Анэтай мы адчуваем сябе вельмі свабодна. Яна сімпатычная і адкрытая на іншых людзей. Не здзіўляе мяне, што моладзь з яе групы з вялікай ахвотай займаецца ў тэатры.

Анэта Снарская і аўтаркі

Нараўчанскі „Антракт” можа пахваліцца шматлікімі поспехамі.

— Тры гады таму мы занялі III месца ў конкурсе арганізаваным куратарам і паліцыяй, — кажа спадарыня Анэта. — Канкурэнцыя была вельмі вялікая, бо да конкурсу прыступіла аж 70 тэатральных гурткоў.

Год пазней яны пацвердзілі сваю творчую сілу і іх спектакль „Гісторыя аднаго кахання” атрымаў вылучэнне. Маладыя акцёры, апрача выступленняў у Беластоку і Нараўцы маюць магчымасць выступаць ў іншых гарадах. У мінулым годзе яны ўдзельнічалі ў тэатральна-вакальных майстар-класах у Плоцку, дзякуючы якім пабачылі і навучыліся шмат новага.

— Мы там сустрэлі цікавых і творчых людзей з цэлай Польшчы, — дадае Анэта Снарская. — Вядома, што такія новыя памкненні ўзбуджаюць творчыя сілы і малады чалавек можа развівацца разам з культурай. Я прыкмеціла, што цягам апошніх гадоў вясковая моладзь мае ўсё больш магчымасцей развіваць свае здольнасці. Паўстае многа гурткоў, капэлаў, аб’яднанняў. Гэта класна! Дзякуючы ім мы можам менш балюча дарастаць і пазітыўна думаць пра людзей і свет.

„Цікаўнасць”,
Наталля Кандрацюк-Свярубская,
II клас III Агульнаадукацыйнага ліцэя ў Беластоку; супрацоўніцтва:
Уля Беразавец,
I клас Гімназіі ў Нарве.

Сустрачанская гульня ў тэатр

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Музыка з кайфам

Менскія меламаны

Музыка для іх гэта не спосаб на зараблянне грошай. Музыка перш за ўсё гэта спосаб на сяброўства. Хаця запісваюць поўнаінструментальныя альбомы, гурт складаюць толькі дзве асобы: двух гітарыстаў і заадно двух вакалістаў. Зміцер Язвінскі і Дзяніс Філіпенка ствараюць менскі гурт „Rahis”. На апошнім „Басовішчы” ўдалося мне пагутарыць пра іх новы альбом „Сшытак з тэкстамі ў малюнках”.

Basovka: — Альбом мае цікавую вокладку.

„Rahis”: — Гэта звязана з песнямі, якія ўвайшлі ў гэты альбом. У нас іх сапраўды шмат, рознай свежасці. Ёсць сапраўды старыя, але хацелася іх проста запісаць. З другога боку маем шмат новага рэпертуару, але не ўсім новым песням знайшлося месца ў сшытку. Хочацца сказаць, што мы шмат песень законсервавалі, а зараз адкрываем слоік, калі ласка, частуйцеся. Пры чым слоіка не закручваем.

— **Ствараеце спецыфічны гурт, які, нягледзячы на папулярнасць, хіба ўсё ж такі застаецца ў нейкім андэрграўндзе?**

— З нас нават апошнім часам падсмейваліся, што хіба як адзіныя не выступалі ў „Рэактары” (папулярны музычны клуб у Менску — рэд.), то і нарэшце выступілі (смех). Мы займаемся музыкай перш за ўсё для сябе. Не працуем так, як завее вецер, у тым сэнсе мы абсалютна незалежныя. Не ствараем попу, каб быць папулярным ці металу, каб прыпадабацца металістам. Мы запішам песню ў адным і другім жанры, калі ў нас будзе такі настрой. І не будзем пераймацца, што каму-небудзь гэта не спадабаецца. Дарэчы, у нас асноўная ідэя ствараць песні на беларускай мове і найхутчэй у якасці поп-рок песень несці гэта як найшырэйшаму колу слухачоў.

— **З вамі выступаюць розныя музыкі. Як дабіраеце супрацоўнікаў?**

— Гэта залежыць ад моманту і патрэбы. Напэўна калі хтосьці ў час гутаркі скажа, што яму цікавы толькі адзін жанр, зразумела, мы з ім працаваць не будзем. Наш гурт ствараюць меламаны! Мы слухаем усё магчымае і на колькі час дазваляе, таму і не абмяжоўваем сябе ў музыцы.

— **Адкуль у вас задума на такую назву?**

— Гэта з грэцкай мовы. Rahis — асноўная вось ліста, якая аб’ядноўвае ўсё побач, так, як нас аб’ядноўваюць нашы думкі наконт музыкі. Калі так задумацца, то можа і гурту ніякага няма, ёсць толькі мы, Дзімос і Дзяніска. Таму не верце, калі хтосьці напіша: «„Rahis” распадаецца!». Ён не можа проста знікнуць, пакуль ёсць мы.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 31

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 27:

Дух, мост, крыло, крыніца, гром, роў, сена, бык, даніна, конь. Дах, грыб, крок, кроў, Рым, ранг, сан, ліпень, моц, аванс, транс.



Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Цешыць вока драўлянае будаўніцтва

— Скансэн Сцяпана Чабая ў Новым Беразове вельмі добра арганізаваны і можна ў ім пазнаёміцца з культурнымі асаблівасцямі мясцовага насельніцтва ў мінулым і архітэктурнымі адметнасцямі драўлянага будаўніцтва. Відаць, што рэканструюючы скансэн, спадар Чабай не забыў пра дэталі, напрыклад на вокнах, ці аздабленні, — заяўляе Аліцыя Рудоўская — студэнтка аддзялення архітэктуры Політэхнічнага інстытута з Варшавы.

Ужо больш дзесяці гадоў Сцяпан Чабай жыве ў адноўленай старой хаце з канца XIX стагоддзя ў Новым Беразове

— Драўлянае будаўніцтва ў Новым Беразове адметнае ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Польшчы, але ў агульным падобнае. Можна ўбачыць тут цікавыя аздабленні будынкаў, але ўсе яны выкананыя ў падобным стылі. У агульным вёска задбаная, а ў драўляных даўніх будынках няма вялікіх змен, якія сапсавалі б іх прыгожую архітэктуру, — расказваюць Анна Алешчук, Магда Паўлікевіч і Аліцыя Рудоўская — студэнткі архітэктуры. У ліпені яны часта наведваюць Сцяпана Чабая, каб дакладна перамерыць яго самую старую хату пад саламянай страхой з XIX стагоддзя і выканаць тэхнічныя рысункі, на якіх будуць адлюстраваны ўсе яе памяшканні і самыя цікавыя дэталі. Студэнткі выконваюць таксама пленэрныя рысункі, на якіх відаць вонкавы выгляд хаты і яе даўнія цікавыя дэталі. Найчасцей у Новым Беразове робяць яны эскізы, каб пасля ў памяшканні Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы выканаць дакладныя рысункі беразоўскага скансэна з неабходнымі вопісамі, якія будуць завяршэннем іх стажыроўкі.

— Студэнткі архітэктуры выконвалі вельмі дакладныя тэхнічныя рысункі, якія адлюстроўваюць выгляд маёй хаты і пакінулі мне іх ксеракопіі, — заяўляе Сцяпан Чабай.

Звяз беларускай моладзі пад наглядам Маршалкоўскай управы, а канкрэтна яе Дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны паспяхова рэалізуе праект Падляшскі культурны шлях „Дрэва і сакрум”.

У рамках рэалізацыі гэтага праекта студэнты архітэктуры Політэхнічнага інстытута з Варшавы збіралі матэрыялы па драўлянай архітэктуры ў выбраных вёсках Гайнаўскай, Нарваўскай, Дубіцкай і Бельскай гмін і зрабілі інвентарызацыю пяці даўніх драўляных аб’ектаў XIX стагоддзя.

— Стажыроўка нашых студэнтаў адбываецца ў рамках супрацоўніцтва паміж нашым аддзяленнем архітэктуры, Дэпартаментам культуры і нацыянальнай спадчыны Маршалкоўскай управы ў Беластоку і Звязам беларускай моладзі, які збірае матэрыялы да праекта „Дрэва і сакрум”. З прапановай адлюстравання ў працах студэнтаў і на здымках беларускай драўлянай вясковай забудовы выйшлі да мяне дырэктар Дэпартамента культуры Анатоль Вап і дырэктар Музея вёскі Артур Гавел, — заяўляе доктар інжынер-архітэктар Цэзары Глушэк з факультэта кансервацыі помнікаў аддзялення архітэктуры Політэхнічнага інстытута ў Варшаве, ураджэнец Гайнаўкі. Наведваючы родны горад, мае ён нагоду назіраць, як мяняецца драўляная архітэктура. — Нашы студэнты выконваюць таксама пленэрныя рысункі, на якіх відаць мастацкі позірк гэтых асоб на даследаваную імі забудову. Глянуўшы на рысункі відаць, як іх аўтар бачыць цікавыя аб’екты і на што звяртае ўвагу. Апрача пленэрных і тэхнічных рысункаў нашы студэнты фатаграфуюць даследаваныя драўляныя будынкі, звяртаючы ўвагу на іх асаблівасці, нестандартныя вокны, дзверы, замкі ў дзвярах, на дэталі на падлозе ці печках. Мы выконваем таксама фатаграфіі ўсіх дамоў у даследаваных намі сёлах, з памячэннем на картах драўляных забудоў, але не робім дакладнай інвентарызацыі вясковых вуліц і па чарзе драўляных будынкаў, як гэта робяць у час стажыровак студэнты аддзялення архітэктуры Політэхнічнага інстытута з Беластока.

Калі я наведаў студэнтаў, якія ў памяшканні гайнаўскага музея выконвалі рысункі, яны ў асноўным намагаліся адлюстраваць у сваіх працах выгляд даследаваных імі пяці даўніх драўляных будынкаў. У час стажыроўкі студэнты займаліся хатай збудаванай у шасцідзесятых гадах XIX стагоддзя ў Макаўцы (Нарваўская гміна), драўляным домам у Трывежы з гэтага ж перыяду, былым млыном у Парцаве, найстарэйшым домам у скансэне Сцяпана Чабая ў Новым Беразове і драўлянай хаткай з 1888 года ў Дубічах-Царкоўных. Амаль усе гэтыя будынкі спалучае адна прыкмета — саламяная страха. З ліку даследаваных будынкаў цяпер самы лепшы выгляд мае хата з канца XIX стагоддзя ў Новым Беразове, якую Сцяпан Чабай грунтоўна аднавіў і жыве ў ёй ужо больш дзесяці гадоў. Студэнтаў моцна зацікавіла тое, што засталося ад абсталявання млына ў Парцаве, на падставе якога маладыя асобы зрабілі рэканструкцыю ўсяго ўнутранага абсталявання млына.

— Даследаваны намі дом у Дубічах-Царкоўных крыты саломай пачынае ўжо хіліцца і паволі развальваецца. Пакрывіліся ў ім сцены і паперасоўваліся бэлькі, а ўпрыгожанні вуглоў паадпадалі ад старасці. Аднак у гэтым доме захавалася вельмі арыгінальная драўляная завеса, прымацаваная жалезнымі цвікамі, якая працуе па сённяшні час, — тлумачаць Ізабела Цабан і Альжбета Мусей, паказваючы рысункі і здымкі гэтага дома і вельмі арыгінальнай завесы. — У Дубічах захавалася яшчэ крыху цікавых драўляных дамоў.

Некаторыя драўляныя будынкі нішчэюць і калі іх уласнікі не маюць сродкаў на іх рамонт, цяжка іх у гэтым абвінавачваць. Часта ў гэтых дамах усё моцна знішчанае і вельмі складана было б прыстасоўваць іх да пастаяннага жыхарства, так як зрабіў гэта Сцяпан Чабай з Беразова. Нейкім выхадам было б рамантаванне такіх хатак у рамках нейкіх праектаў.

Студэнты аддзялення архітэктуры Політэхнічнага інстытута з Варшавы многа працы ўклалі падчас выконвання тэхнічных рысункаў (на здымку ў Гайнаўскім музеі)

— Відаць, што рэгіён паволі губіць сваю архітэктурную тоеснасць. Паміж старой драўлянай архітэктурай многа мураваных будынкаў і драўляных дамоў, будаваных на сучасны выгляд. Штораз менш тут таксама характэрных для гэтага рэгіёна аканіц і вуглоў. Мала ўжо таксама ганкаў забудаваных толькі знізу, якія былі ў старэйшых хатах, — кажа доктар Цэзары Глушэк. Лічыць ён, што апошнім часам новая мода псуе краявід нашых вёсак, а гэтыя змены заўважаюць не толькі спецыялісты па архітэктуры, але і турысты.

— У мінулым дом будаваўся з улікам трываласці будаўнічых матэрыялаў, патрабаванняў людзей, якія заказвалі дом і іх фінансавых магчымасцей, а майстры даглядалі захавання адпаведных прапорцый хат. Зараз часта новыя дамы, што ўзнікаюць пасля перабудовы старых, не падыходзяць да акружаючага краявіду, бо ў іх сапсаваныя не толькі агульныя прапорцыі забудовы, але таксама акон ці дзвярэй. Трэба мець вельмі вялікія ўмеласці, каб правільна разбудаваць і мадэрнізаваць даўні дом, альбо карыстацца прафесійнымі парадамі архітэктараў, — гаворыць Цэзары Глушэк.

Цяжка таксама патрабаваць, каб людзі толькі правільна рамантавалі старыя хаткі і не будавалі новых дамоў. Праблема не ў тым, што маладое пакаленне будуе вялікія шыкарныя дамы, а ў тым, што іх архітэктура часта не падыходзіць да мясцовага краявіду, напрыклад, узятая з іншых рэгіёнаў Польшчы. Найбольш відаць гэта, калі будуюцца дамы са стромкімі дахамі, характэрнымі для горнага краявіду.

— Трывежа ў агульным захавала выгляд падляшскай беларускай вёскі, толькі там ёсць праблема пустуючых і нішчэючых хат. Перабудова вясковай архітэктуры ў Новым Беразове адбывалася паволі і эвалюцыйна і таму гэтае сяло захавала цікавы клімат вясковай архітэктуры, хаця захавалася там крыху дамоў, якія да яе не падыходзяць. У Макаўцы многа даўніх драўляных цікавых дамоў, але выгляд многіх хат зменены, калі яе жыхары паклалі на іх сайдынгавыя шалёўкі. У Дубічах многа новых дамоў і таму там мала зараз хат характэрных для драўлянай вясковай архітэктуры. У Парцаве вясковага драўлянага будаўніцтва таксама мала, — лічыць доктар Цэзары Глушэк.

Звяз беларускай моладзі хацеў бы арганізаваць выстаўку пленэрных рысункаў з выявамі драўлянага будаўніцтва, выкананых студэнтамі Політэхнічнага інстытута з Варшавы. Доктар Глушэк не супраць такой ідэі, якая дала б магчымасць паглядзець старую вясковую забудову наведвальнікам выстаўкі.

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Праз дваццаць гадоў

Нунцыі Каталіцкага касцёла не разумеюць нацыянальнай сітуацыі ў Беларусі, палякі ў Беларусі масава адмаўляліся пры канцы апошняй вайны ўступаць у Чырвоную Армію, Саюз палякаў у Беларусі Анжалікі Борыс дзейнічаў толькі каб пратрымацца, польскі рух у Беларусі павінен быць задзіночаны, — гэта толькі некаторыя са шматлікіх высноў, якія прагучалі ў час навуковай канферэнцыі „Саюз палякаў у Беларусі — 20-годдзе дзейнасці".

Сарганізавалі яе ў Вышэйшай школе публічнай адміністрацыі ў Беластоку. Прыслухоўваліся ёй прадстаўнікі Міністэрства замежных спраў і консул РП у Гродне. На жаль, слухачамі канферэнцыі былі амаль самі дакладчыкі. Без сумнення, галоўным героем быў Тадэвуш Гавін, першы старшыня СПБ. Калі „Ніва" папрасіла ў яго ацаніць цяперашнюю сітуацыю ў СПБ, адказаў востра: „На гэтую тэму нічога не буду казаць. Я не ва ўладах саюза, дык нашто мне выказвацца!"

Шмат матываў канферэнцыі датычыла найнавейшай гісторыі звязанай з дзейнасцю і сітуацыяй палякаў у Беларусі. Паявіліся матывы кранаючыя ранейшы час, як, напрыклад, перыяд апошніх гадоў вайны і непасрэдна пасляваенных. Спасылаючыся якраз на перыяд канца II сусветнай вайны і першых гадоў пасля яе заканчэння, дацэнт Анатоль Вялікі з Дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта ў Мінску ўспомніў (па-беларуску):

— Пасля вайны ў Беларусі засталося найбольш палякаў з усіх рэспублік СССР. Улада ад 1943 года абмяркоўвала, ці мае адносіць іх да касцельных палякаў ці спольшчаных беларусаў. Тое, што палякі ёсць, паказала першая хваля рэпрэсій у саракавыя гады. 550 тысяч асоб выказаліся за польскасцю, хацелі выехаць у Польшчу. Стасунак да палякаў у той час быў асцярожны, але і насцярожаны. У апошнія гады вайны палякі масава адмаўляліся ад службы ў Чырвонай Арміі, хацелі ісці ў польскае войска. Былі адкрытыя бунты. У Барысаве, напрыклад, аж каля тысячы палякаў дэкларавала ахвоту служыць у польскім войску.

Анатоль Вялікі прыгадаў таксама, што палякі ў Беларусі масава не падпісваліся пад заклікам удзячнасці Сталіну за вызваленне БССР ад гітлерызму:

— Так было ў цэлых раёнах, як у Сапоцкінскім, але не далося масава рэпрэсаваць цэлых раёнаў. Пасля палякі зніклі нават з палітычнага лексікону. Пасля смерці Сталіна паняцце „паляк" у Беларусі не існавала, не было польскіх школ і арганізацый. Толькі з 1989 года стала магчымым, што палякі гэта не грамадзяне польскай нацыянальнасці, а польская меншасць з правам на ўласнае школьніцтва, культуру і кантакты з уласнай метраполіяй.

Прафесар Здзіслаў Вінніцкі з Вроцлаўскага ўніверсітэта (мадэратар сустрэчы разам з Тадэвушам Гавіным) уключыўся:

— Незалежна ад паўсюднай думкі, з даследаванняў аказалася, што найменш палякаў уступала ў Камуністычную партыю Беларусі. Гэтаксама было і ў Літве.

У час канферэнцыі неаднойчы кранаўся матыў адносін у Беларусі палякаў і Каталіцкага касцёла. Ксёндз праф. Раман Дзванкоўскі з Каталіцкага люблінскага ўніверсітэта:

— Да 1991 года Каталіцкі касцёл у Беларусі быў часткай Касцёла ў Польшчы.

Дадаў, для зацікаўлення слухачоў:

— Тэрміналогія, напр., Касцёл беларускі ці ўкраінскі неадпаведная. Намякае на стварэнне нацыянальных касцёлаў і закладвае элімінацыю беларускай ці ўкраінскай мовы ў літургіі. Адпаведным з'яўляецца прымянянне паняцця „Касцёл у Беларусі, Касцёл ва Украіне". Як сказаў Ян Павел II, „кожны мусіць знайсці айчыну ў Касцёле". (...). Ёсць многа сігналаў, што нунцыі не разумеюць нацыянальнай сітуацыі ў Беларусі. З культурна польскага, Касцёл у Беларусі становіцца культурна беларускім.

І адзначыў:

— Калі правы ў Касцёле ў Беларусі будуць захаваны, такая будзе будучыня палякаў у Беларусі.

Ад уплыве „перабудовы" на пачатку інстытуцыянальнага польскага адраджэння ў БССР гаварыў праф. Мікалай Іваноў з Апольскага ўніверсітэта:

— Са шматлікімі праблемамі, звязанымі са станаўленнем польскага руху, якія нарадзіліся ў першыя тры гады перабудовы, маем дачыненне да сёння. Перабудовай палякі ў Беларусі пакарысталіся найбольш сціпла з ліку іншых нацый СССР. Палякі лічылі сябе ў той час не нацыяй, а грамадскай групай: сялян, рабочых, але ўжо не інтэлігенцыяй, бо яе ўжо ў Беларусі не было.

Прыгадаў успаміны Тадэвуша Гавіна, змешчаныя ў ягонай кнізе:

— У той час, каб штосьці аформіць, тэлефанаваў у Маскву, дзе яго лепш разумелі, чым у Мінску. Ніхто не верыў, што можна вызваліцца ад партыйнага кіраўніцтва. У Мінску польскі рух успрымаўся, але не лічылі яго чымсьці пагрозлівым.

У досыць крытычным тоне праф. Іваноў заявіў:

— На працягу першых трох гадоў перабудовы польскі рух у Беларусі мог бы здабыць значна больш. Дзеянні пад кіраўніцтвам Тадэвуша Гавіна былі вельмі сціплыя, а палякі ў Беларусі маглі здабыць мінімум аўтаномію.

Пасля Тадэвуш Гавін бараніўся:

— Мая дзейнасць у войску [быў афіцэрам пагранічных войскаў — М. Х.] была ахоўным парасонам, як мне сказала калісьці пані Цывінска [Ізабела Цывінска, дзяячка Згуртавання „Wspólnota Polska" ў Беластоку — М. Х.]. Палякаў трэба было прымушаць да дзеянняў. Ад пачатку стратэгічнай мэтай саюза было адраджэнне школьніцтва, значыць, школ з польскай мовай навучання. На пачатку ніхто не верыў, што ўзнікне школа ў Гродне. Тактыка апрацоўвалася пад гэты крытэрый.

Прызнаўся:

— Мяне моцна крытыкавалі за тое, што я шчыльна супрацоўнічаў з няўрадавымі арганізацыямі. Калі б беларусы не падтрымалі нашага адраджэння, не было б польскай школы. Падтрымаў нас у той час лідар Беларускага народнага фронту Зянон Пазьняк.

Успамінаючы пра ўстановы, якія былі партнёрамі ў стварэнні адроджанага польскага руху ў Беларусі, заявіў: „Трэба было змагацца з польскай дыпламатыяй".

Спасылаючыся яшчэ на праблематыку звязаную з польскім школьніцтвам: „Чаму наша тактыка не задзейнічала ў Лідзе ці Воранаве? Бо не хапіла адпаведных людзей. У Шчучыне былі, але школа і так там не ўзнікла. Тадышняя тактыка да сёння не зрэалізавана".

Аб чарговых кіраўніцтвах СПБ, падтрымліваных адміністрацыяй Аляксандра Лукашэнкі: „Іх нанялі для таго, каб тая тактыка не рэалізавалася. Саюз Анжалікі Борыс і Анжалікі Арэхвы не зможа зрэалізаваць нашых мэт. Толькі задзіночаны, моцны і неразбіты саюз можа зрэалізаваць статутныя заданні!"

Аб праблемах польскай меншасці ў Беларусі ў польскай замежнай палітыцы расказаў Марыюш Машкевіч, былы консул РП у Гродне, а затым пасол РП у Мінску:

— Беларусь сапраўды лічылася найбольш ангажаванай у пабудову савецкай сістэмы і савецкага чалавека краінай.

Прааналізаваў м.інш. дзве, яшчэ даваенныя канцэпцыі польскай усходняй палітыкі: нацыянал-дэмакратычную з адбудовай нацыянальных дзяржаў, першапачаткова ўсхваляную Раманам Дмоўскім і „ягелонскую" (федэратыўную), за якой стаяў Юзаф Пілсудскі, а пасля стваральнік парыжскай „Культуры" Ежы Гедройц:

— На карце апошняга дваццацігоддзя гэтыя ідэі далей функцыянавалі. Мы ўсё знаходзімся ў аковах Гедройца, значыць, падтрымцы непадлегласці дзяржаў пры падтрымцы меншасцей (...). Замоцная прысутнасць польскай федэратыўнай канцэпцыі ва Усходняй Еўропе пагражала б інтарэсам галоўным чынам Расіі і, мабыць, часткі Беларусі. Спасылаюцца тут прапагандысцка на сітуацыю на Балканах (...). Падтрымка еўрапейскіх інструментаў у польскай замежнай палітыцы абмежаваная, не такая, якая ад нас чакалася.

Прафесар Вінніцкі вярнуўся да часу СПБ пад кіраўніцтвам Тадэвуша Гавіна:

— Група палякаў, згуртаваная вакол Тадэвуша Гавіна, падтрымала апазіцыю, ды другая група лічыла, што гэта неадпаведнае. СПБ Анжалікі Борыс мог трымацца толькі дзеянняў на праіснаванне, без рэалізацыі ідэйна-праграмных планаў. Толькі пасля вяртання да нармальнасці можна будзе параўноўваць СПБ да таго з першых дзевяностых гадоў.

Доктар Міраслаў Габоўскі з Вроцлаўскага ўніверсітэта распавядаў пра палітыку РП у кантэксце прац сеймавай камісіі лучнасці з палякамі за мяжой. Раней у размове з „Нівай" сказаў:

— Найбольшай праблемай, перад якой стае камісія, з'яўляецца факт немагчымасці поўнасцю легальнай дзейнасці СПБ. Пачалося гэта ў 2005 г. Аказалася, што магчымасць вядзення цвёрдай польскай палітыкі на гэты конт аказалася немагчымай. Прытым ЕС незацікаўлены ацяпляннем адносін з Беларуссю. Міністр Сікорскі ўпісваецца ў гэтую палітыку, што яму закідвалі дэпутаты ад ПіС у Камісіі. Палітыка ізаляцыі не апраўдваецца. Мы павінны дбаць аб захаванне непадлегласці Беларусі і дапамагаць ёй у дэмакратызацыі.

Згодна з вынікамі перапісу ў Беларусі пражывае цяпер каля 400 тысяч палякаў. У канферэнцыі — як тлумачылі яе арганізатары — па прычыне хваробы не прысутнічала выконваючая абавязкі старшыні СПБ Анжаліка Арэхва. Канферэнцыю арганізавалі: кафедра міжнародных арганізацый ВШПА, кафедра ўсходніх даследаванняў Інстытута міжнародных студый Варшаўскага ўніверсітэта ды Фонд дапамогі дзецям з Гродзеншчыны, пры падтрымцы м.інш. Радыё Рацыя.

Уладзімір СІДАРУК

Летапіс чаромхаўскай асветы

(1)

Пра мінулае чаромхаўскай асветнай сістэмы размаўляў я з многімі старажыламі. Шмат ведаў захавалася ў мяне з маладосці. Пакарыстаўся я таксама школьнай хронікай. І вось узнік летапіс, які расказвае пра мінулае і сённяшнія будні асветы ў Чаромсе. Вось першы запіс, які датычыць 1987 года:

«Пасёлак Чаромха размешчаны непадалёк усходняй мяжы. З'яўляецца ён сядзібай мясцовага самаўрада. У гміне Чаромха пражывае 4 391 жыхар, у тым ліку ў пасёлку — 2 504. У пасёлку Чаромха — два вядучыя прадпрыемствы: насычальня шпалаў і паравозная дэпо. Працуюць і іншыя чыгуначныя ўстановы — вагоннае дэпо, СОК, прафсаюзныя арганізацыі чыгуначных служб, а таксама Гмінная ўправа, пошта, два асяродкі здароўя (адзін чыгуначны), касцёл, ГОК (кіно, бібліятэка, фоталабараторыя і тэнісны корт), мытная кантора, добраахвотная пажарная каманда, пастарунак міліцыі, пачатковая школа (37 настаўнікаў), дзіцячы садок, асяродак сучаснай гаспадыні, прадпрыемства прафесіянальнага ўдасканалвання, чыгуначны вакзал (у пабудове), спартыўны стадыён побач паравознага дэпо, рэстаран („Прыгранічная" — У. С.), 6 гандлёвых пунктаў, 5 кіёскаў „Рух" і некалькі прыватных рамесніцкіх майстэрняў, якія аказваюць паслугі мясцоваму насельніцтву».

Аднак адсутнічаюць даныя аб школе, якая існавала пры царскім парадку (пацярпела ад пажару ў час Першай сусветнай вайны). Дваццаць гадоў міжваеннага перыяду таксама нельга аднавіць, паколькі няма даных. Хроніка састаўлена паводле аповедаў старажылаў, якія расказвалі павярхоўна, паколькі не былі яны ў шчыльных кантактах са школай.

Школу ў Чаромсе арганізавалі пасля польска-савецкай вайны ў 1921 годзе. Навучаннем займалася чатырох прыезджых настаўнікаў. Кіраўніком быў пан Домбэк. Вучыліся дзеці з Чаромхі, Ставішчаў, Кузавы, Гайкаў і Вулькі-Тэрахоўскай. Мяркуецца, што вучылася каля 150-180 дзетак, паколькі на аднаго настаўніка выпадала каля сарака вучняў. Заняткі адбываліся на дзве змены. У школе дзейнічала гарцэрства, а займаўся ім настаўнік Франкоўскі.

Новы драўляны будынак на патрэбы сямігодкі быў збудаваны ў 1939 годзе. Тады працавала пяць настаўнікаў. Карысталіся яны службовымі кватэрамі. У першых днях вайны будынак пацярпеў ад бамбёжкі і стаў непрыдатным для далейшага карыстання. Пры саветах новая ўлада неадкладна занялася навучаннем. Школу арганізавалі ў былым нямецкім бараку з часу Першай сусветнай вайны. Была гэта школа № 8 з няпоўным профілем сярэдняй адукацыі з шасцю аддзяленнямі. На жаль, не захавалася прозвішча яе загадчыка. Абавязковай была руская мова. Пасля былі ўведзены прадметы польскай і нямецкай мовы.

У час нямецкага нападзення на Савецкі Саюз настаўнікі разбегліся. Аднак у верасні 1941 года ў Чаромсе арганізавалася чатырохкласная школа. Арганізатарам, а заадно і загадчыкам, стаў настаўнік са Ставішчаў Ігнацы Возьны, а дапамагала яму Стэфанія Сахацкая, якую ваенны лёс кінуў у Чаромху. Урокі праводзіліся на польскай мове. Зарплату настаўнікам выплачваў кляшчэлеўскі самаўрад. Аднак у наступным годзе палучкі былі адменены па прычыне недахопу грошай.

Узнагароды пераможцам (ус)

Вучні чаромхаўскіх школ ад некалькіх гадоў удзельнічаюць у акцыі збірання другаснай сыравіны. Сёлета ў Пачатковай школе ў акцыі ўдзельнічала 29 вучняў. На працягу навучальнага года сабралі яны 31 692 алюмініевыя банкі, 27 331 пластмасавую бутэльку, 3 848 кг макулатуры і 145 мяшкоў шклатары. Ацэнка ўдзельнікаў акцыі праводзілася на аснове колькасці атрыманых імі балаў. Пераможцам стаў вучань IV „б" класа Давід Рошчанка, які набраў 9 100 балаў. Чарговыя месцы занялі Матэвуш Гаеўскі — 5 498 балаў, Данель Дудалевіч — 5 303 балы і Моніка Бандарук — 3 949 балаў.

У Гімназіі ў акцыі ўдзельнічала восем вучняў і сабралі яны 10 707 алюмініевых банак, 6 549 пластмасавых бутэлек, 922,5 кг макулатуры і 4 мяшкі шклатары. Выдатнікам стаў Адрыян Каліноўскі — 6 103,5 бала, Мілена Пташнік — 4 460 балаў, Марцін Алексяюк — 1 966 балаў, і Катажына Шыманчук — 1 159,5 бала.

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

І так, пераможца з Пачатковай школы Давід Рошчанка атрымаў горны ровар „Трагер". Лаўрэаты II і III месц былі ўзнагароджаны музычнымі цэнтрамі, а IV і V месцаў — фотаапаратамі.

Гімназіст Адрыян Каліноўскі за першае месца атрымаў дамашняе кіно. З ліку гімназістаў лаўрэат II месца атрымаў фотоапарат, III — МП4-плэер, а IV — пантон.

У гэтым годзе Павятовае староства абмежавалася адно да кніжных сувеніраў, затое Гмінная ўправа прызначыла на ўзнагароды 2 993,91 зл.

☞ *Давід Рошчанка з узнагародай*

BELARUSIANS IN BRITAIN | Беларусы ў Вялікабрытаніі

Беларуская грамада ў Вялікабрытаніі заснавалася даўно. Канец Другой сусветнай вайны можна лічыць пачаткам з'яўлення на туманным Альбіёне беларусаў, якія імкнуліся захаваць сваю нацыянальную самасвядомасць, арганізуючы жыццё і дзейнасць дыяспарных суполак.

Сёння брытанскія беларускія арганізацыі — адны з найбольш актыўных беларускіх суполак у свеце. Таму натуральна, што ў часы імклівага развіцця інтэрнэту яны прадстаўленыя ў сусветным павуцінні разнастайнымі сайтамі.

Сайт http://belarusians.co.uk („Беларусы ў Вялікабрытаніі") зроблены неяк зусім па-англійску — усё на ім акуратна, строга і функцыянальна. Значных мастацкіх аздабленняў на сайце не заўважыш, хаця нельга адмовіць ягоным стваральнікам у разуменні вартасці далучэння да тэкставай інфармацыі фотаілюстрацый.

Сайт падзелены на дзве часткі — левая, шырэйшая, змяшчае ўсю асноўную інфармацыю, якая тычыцца штодзённага жыцця брытанскіх беларусаў альбо падзей, якія тым ці іншым чынам звязаныя з Беларуссю. Адметна, што перакладам інфармацыі з англійскай мовы на беларускую і наадварот уладальнікі сайта сябе не абцяжараюць. Таму на сайце мы можам убачыць як англамоўныя, так і беларускамоўныя нататкі і, каб іх прачытаць, варта ведаць абедзьве мовы, што з'яўляецца натуральным, пэўна, для ўсіх беларусаў Вялікабрытаніі.

«Вэб-сайт „Беларусы ў Брытаніі" служыць усёй беларускай супольнасці ў гэтай краіне. Ён не належыць ніводнай арганізацыі, але служыць патрэбам ды інтарэсам беларусаў, беларускіх ініцыятываў і арганізацыяў. Праз распаўсюд інфармацыі мы імкнемся садзейнічаць усяму цікаваму й карыснаму, што нараджаецца ў беларускім жыцьці», — канкрэтызуюць свае мэты і задачы брытанскія беларусы на старонцы „Пра сайт".

Праўда, стваральнікі сайта сціпла абазначаюць сябе толькі імёнамі — Ігар і Павел, невядома з якіх прычын не палічыўшы патрэбным больш падрабязна распавесці аб сябе.

Паколькі Лондан з'яўляецца цэнтрам беларускай супольнасці ў Вялікабрытаніі, то пад інфармацыю аб ім адведзена цэлая старонка з аднайменнай брытанскай сталіцы назвай. Праўда, гэтая інфармацыя з большага тычыцца расповеду аб дакладным месцы знаходжання славутай Скарынаўскай бібліятэкі і іншых будынкаў, што належаць беларускім арганізацыям. Практычна ўсё пададзена па-беларуску.

Звесткі пра беларускія суполкі месцяцца на наступнай старонцы, якая носіць назву „Арганізацыі". Яна пададзена даволі сціпла — пра кожную даецца літаральна адзін абзац, аднак гэтага дастаткова, каб не толькі даведацца пра іх існаванне, але і пабачыць іх кантакты. Між іншым тут даюцца звесткі, дзе праводзяць набажэнствы ў Лондане беларускія праваслаўныя вернікі.

Вельмі прыемна ўсведамляць, што брытанскія беларусы здольныя не толькі да размяшчэння інфармацыі аб сябе ў віртуальнай прасторы. Яны выдаюць газету „Беларус на чужыне" — беларускі штомесячнік у Лондане, які быў заснаваны ў 1947 г. і аднаўлены ў 2009 г. Выданне змешчана і на сайце ў фармаце pdf ды знаходзіцца ў рубрыцы „Публікацыі".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Каму вяршкі, а каму — Карашкоў

Бягучы еўракубкавы сезон пакуль складаецца надзвычай удала для беларускіх футбольных дэлегатаў. Беларусь нават часова, па выніках двух раўндаў кваліфікацыі, узначаліла рэйтынгавы спіс краін. Упершыню ў гісторыі адразу тры нашы каманды прабіліся ў трэці раўнд Лігі чэмпіёнаў і Лігі Еўропы. Барысаўскі БАТЭ, мінскае „Дынама", магілёўскі „Днепр" і жодзінскае „Тарпеда" правялі разам 12 матчаў. Іх баланс наступны: 7 вікторый, 4 нічыі і адна параза, пры агульнай розніцы мячоў 35:11.

Адзіная няўдача прыпала на долю жодзінцаў, якія першымі з айчынных прадстаўнікоў зышлі з дыстанцыі. Разышоўшыся на выездзе з бялградскім ОФІ 2:2, дома тарпедаўцы ўсё ж саступілі 0:1. Астатнія працягнуць змаганне. На коне ўжо досыць высокія стаўкі і адпаведна куды больш сур'ёзныя сапернікі. БАТЭ да асноўнага раўнду Лігі чэмпіёнаў засталося зрабіць два крокі. Бар'ерам на гэтым шляху дацкі „Капенгаген", калектыў з высокай маркай і рэпутацыяй. За апошнія 10 гадоў гэты клуб ажно 7 разоў станавіўся чэмпіёнам Каралеўства Даніі і аніводнага разу не злазіў з п'едэстала. У яго складзе нямала легіянераў, асабліва шведскіх. Але і БАТЭ зараз не з гліны зляплены. Так што ад гэтага спабору можна чакаць усяго, а перш за ўсё зацятай спрэчкі. Няпросты апанент дастаўся і мінскаму „Дынама" — „Макабі" з ізраільскай Хайфы. Футбол на Зямлі Абяцанай стала прагрэсуе. Да ўсяго гэта будзе ўжо трэцяе спатканне беларускай каманды з „Макабі". У 2001 г. клуб з Хайфы адолеў мазырскую „Славію", а ў 2002 г. — бабруйскую „Белшыну". Паспяховае выкананне задання дынамаўцамі ўскладняецца канфліктам паміж кіраўніцтвам бела-блакітных і іх лідарамі — Сяргеем Кісляком і Антонам Пуцілам. Абодва апошнім часам былі адлучаны ад асноўнага складу, а без іх патэнцыял „Дынама" істотна зніжаны.

Прыйшло свята і на магілёўскую вуліцу. Адолеўшы па суме дзвюх сутрэч нарвежскі „Стабек", мясцовы „Днепр", прывязе на свае берагі ў трэцім кваліфікацыйным раўндзе чэшскі „Банік" з Астравы. Магілёўскі стадыён „Спартак" зноў будзе запоўнены бітма. А вось на гродзенскі „Нёман" хутка будуць прыходзіць нават не соткі, а дзесяткі і адзінкі заўзятараў. Пакуль адны каштуюць футбольныя вяршкі, іншыя мусяць па-добраму зайздросціць і глытаць сліну. Новым трэнерам гродзенскага „Нёмана" зараз прызначаны спецыяліст з Расіі Аляксандр Карашкоў. Цяжка паверыць у тое, што чужародны трэнер з Саратава зможа нешта талковае зрабіць у структуры клуба, які працягвае дэградаваць. Ужо першы матч пад „новым венікам" нёманцы прайгралі дома са звыклым лікам 0:1. Каманда па-ранейшаму займае незайздроснае 10-е месца ў чэмпіянаце і балансуе на мяжы вылету з вышэйшай лігі. Лідару БАТЭ ўдалося адарвацца ад канкурэнтаў — у чэмпіёна зараз 42 ачкі. А вось за іншыя п'едэстальныя месцы ідзе жорсткае змаганне: салігорскі „Шахцёр" мае зараз 37 пунктаў, ФК „Мінск" і яго землякі з „Дынама" — па 36.

Вызначыліся ўсе ўдзельнікі 1/8-й фіналу Кубка Беларусі. На гэтай стадыі, якая пройдзе пераважна ў верасні, сустрэнуцца „Белшына" (Бабруйск) — „Камунальнік" (Слонім), „Шахцёр" (Салігорск) — „Хваля" (Пінск), „Рудэнск" — „Гомель", „Віцебск" — „Нёман" (Гродна), ФК „Мінск" — ДБК (Гомель), „Нафтан" (Наваполацк) — „Гарадзея", „Партызан" (Мінск) — „Дынама" (Мінск), БАТЭ (Барысаў) — „Дынама" (Брэст). У наступным сезоне пераможца кубка стартуе ў еўракубку ўжо з больш высокага этапу, што стварае дадатковы стымул у змаганні за трафей.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Урочышча Вялікая Клетная

Пётр БАЙКО

На тэыторыі Белавежскай пушчы існуе шмат урочышч, назвы якіх трымаюцца многія стагоддзі. Адным з найстарэйшых тут урочышч несумненна з'яўляецца Вялікая Клетная (Wielka Kletna або Wielkie Kletno). Урочышча гэтае знаходзіцца ў ваколіцах месца, адкуль бярэ свой пачатак рака Арлоўка, даўней называная Еляркай. Назва ўрочышча выводзіцца ад існуючага тут у другой палове XVI стагоддзя першага вядомага нам у Белавежскай пушчы агароджанага звярынца (або, як тады называлі, агарода для палявання), заснаванага пры панаванні караля Стэфана Баторыя (у 1576-1586 гадах). Звярынец знаходзіўся ў аддзелах 374 і 375 — на поўнач ад Броўскай дарогі. Існавала яшчэ таксама Малая Клетная, якая ў сваю чаргу знаходзілася ў аддзеле 402 — на поўдзень ад Броўскай дарогі. У XVI стагоддзі на тэрыторыі Белавежскай пушчы знаходзілася яшчэ адна паляўнічая агароджа — Тэрэміска (сёння на яе месцы дзейнічае Асяродак зубрагадоўлі Белавежскага нацыянальнага парку).

Аб першым у пушчы звярынцы гэтак піша Аляксандр Палуянскі ў другім томе „Opisania lasów Królestwa Polskiego i gubernij zachodnich Cesarstwa Rossyjskiego pod względem historycznym, statystycznym i gospodarczym" (Варшава 1854): „W każdej puszczy wybierano dogodne miejsce na przesmyk zwierząt, ogradzano je parkanem i płotem aby zwierz uciec nie mógł, zewnątrz zaś tego parkanu naokoło budowano dla dostojnych myśliwych ozdobne altany, z których do zwierząt bezpiecznie strzelać mogli. Taki zwierzyniec był w puszczy Białowiezkiej, w dawnej straży Browskiej, blisko źródeł rzeki Jelarki, gdzie część pięknego lasu dębowego, otoczona niegdyś parkanem i płotami, zowie się dotąd zwierzyńcem królewskim albo wielką kletnią. Oprócz tego było kilka innych zwierzyńców (m.in. w Knyszynie i Olicie)".

Міхал Балінскі і Тыматэвуш Ліпінскі ў сваю чаргу падаюць у трэцім томе „Starożytnej Polski pod względem historycznym, jeograficznym i statystycznym opisanej" (Варшава 1846) такую вось інфармацыю аб белавежскім звярынцы: „(...) w straży zaś Browskiej, blisko źródeł rzeki Jelarki, część pięknego lasu zowie się Zwierzyniec Królewski, albo Wielką Kletną. Jest to wielki i suchy ostęp zarosły odwiecznymi dębami, które najwdzięczniej bluszcz obwija; otaczają go parkany i płoty, bo tam spędzano zwierzęta, które królowie ubijali z altan umyślnie w tym celu zbudowanych".

Карта з 1784 года з памечанымі двума агародмі для палявання

Фота Тамаша НЯХОДЫ

Стары дуб ва ўрочышчы Вялікая Клетная — сведка каралеўскіх палявання

У XVIII стагоддзі, пры панаванні каралёў Аўгуста II і Аўгуста III, звярынец Вялікая Клетная быў адноўлены і праўдападобна пашыраны. Пачалі называць яго Аўгустовым садам, Аўгустоўскім садам або Каралеўскім агародам. На сучасных картах урочышча гэтае меціцца ў аддзелах 345 і 346. Няцяжка заўважыць, што ад поўначы мяжуе яно з Вялікай Клетнай.

У 1784 годзе ў Аўгустовым садзе паляваў кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. З гэтай нагоды збудавалі для яго вялікі, трохпавярховы драўляны павільён. Першы паверх займалі слугі. На другім паверсе быў прасторны пакой для караля, засцелены рознага роду дыванамі. Найвышэйшы паверх быў адкрытым балконам, з якога можна было назіраць за ходам палявання. Павільён размяшчаўся ля паўночнага боку агароджы, пры скрыжаванні платоў (шыі пасткі). Сама агароджа мела форму напамінаючага эліпс многавугольніка, падзеленага на 5 унутраных сядзіб. Быццам след павільёна і плота былі прыкметныя да канца XIX стагоддзя. У цяперашні час ніякага следу ад звярынца не засталося.

Вінавата гарачыня

Уладзімір СІДАРУК

Прыйшлося мне 15 ліпеня падарожнічаць у Беласток. Паколькі раніцай выязджаў я з Чаромхі туманнай, шэрай раніцай, дык у Беластоку на станцыі Стадыён выйшаў на мокры перон. Значыцца, пайшоў дождж. А сябры ў „Ніве" сказалі, што два дні таму ў Беластоку прайшоў сапраўдны лівень. Вада не змяшчалася ў каналізацыйныя калодзежы. А зараз была сапраўдная спёка. У аўтобусе нельга вытрымаць. Вяртаўся я пасля абеду аўтобусам № 10 на чыгуначны вакзал. У аўтобусе маладая жанчына абамлела ад гарачыні. Некалькі жанчын, якія знаходзіліся побач, кінуліся на дапамогу. Пачалі рабіць штучнае дыханне. Шафёр выклікаў хуткую дапамогу і заявіў, што не паедзе далей. Да вакзала было яшчэ два прыпынкі. Набліжалася 14 гадзіна. Шмат пасажыраў пачало хвалявацца, паколькі набліжаўся час ад'езду цягнікоў. Мой цягнік у Чаромху адпраўляўся ў 14:27. Пачуўся сігнал хуткай дапамогі і пасажыры палічылі, што гэта па „нашу хворую" едуць. Але аўтамабіль хуткай дапамогі пашпарыў на сігнале ў напрамку вуліцы Гетманскай. Шафёр вылаяўся і схапіў трубку аўтобуснага радыётэлефона...

Пад'ехаў аўтобус № 1 і мы са шматлікімі пасажырамі пераселіся на яго. На вакзал заехалі пяць хвілін перад 14-й гадзінай. Аб'яўлялі ад'езд цягніка ў Шэпятова. Я забяспечыўся у прывакзальным кіёску напіткам і пакетам марожанага ды падаўся на чацвёрты перон. Праз паўтары гадзіны быў у Чаромсе. Варта адзначыць, што ў новых рэйкавых аўтобусах працуе кандыцыянер і не адчуваецца гарачыні, якая царыць навокал нас. А ў Чаромсе на адвячорку тэрмометр паказваў 35 градусаў і стаяла бязветранае надвор'е. У такі час лепш з дома не выходзіць, адно ў цяньку хавацца або над вадой загараць.

* * *

Наступнага дня а палове дзесятай паехаў я ў Гайнаўку на рэйкавым аўтобусе. Ужо тады тэрмометр паказваў каля дваццаці пяці градусаў. Але ў аўтобусе з кандыцыянерам гэтага не адчувалася. Праўда, ён не працаваў пастаянна, бо машыніст выключыў яго ў палове дарогі, але добра і гэта.

Гэтым жа аўтобусам вяртаўся я дамоў у 13:30. Гарачыня невыносная. На станцыі ў Гайнаўцы да ад'езду цягніка заставалася пятнаццаць мінут. Дзверы ў аўтобусе былі адкрыты з абодвух бакоў, а кіраўнік цягніка дадаткова паадкрываў акенцы, бо кандыцыянер не працаваў. Спадарожнічаў мне знаёмы з Нурца-Станцыі Мікалай Швед, які калісьці пастаўляў у Чаромху смакавіты хлеб. Але сябрук пакінуў айчынны бізнес і падаўся за мяжу. Але і там яму не пашанцавала. Па прычыне здароўя вымушаны быў вяртацца назад. Прайшоў аперацыю пазваночніка, зараз праходзіць рэабілітацыю ў гайнаўскім шпіталі. Дамоў едзе на часовае звальненне, бо жончына хрышчоная дачка замуж выходзіць. Меў ехаць на аўтобусе ПКС, але параілі пакарыстацца чыгункай. З Гайнаўкі выехалі пунктуальна. За Вітавам цягнік пачаў псавацца, а пасля зусім заглох. Кандыцыянер не працаваў. Механік разрываўся на часткі, каб завесці матор, але машына не кранала з месца. Кіраўнік рашыўся ужо звярнуцца па радыётэлефоне да дыспетчара, каб другую цягу падаслаў. Абышлося дзякуюцы кемлівасці машыніста. Сам ён устараніў прычыну аварыі ў машыне і шчасліва давёз пасажыраў у Чаромху. «Добра, што гэта Яўген Ваўранюк ехаў, сам інструктар машыністаў, — каментаваў пасля кіраўнік цягніка, — бо прыйшлося б тры гадзіны ў чыстым полі стаяць». З гэтага цешыўся найбольш сябра з Нурца. Паспеў ён на перасадку на цягнік у Седльцы. А ўсяму вінаватая гарачыня, якая перамагла кандыцыянерную тэхніку.

Адгаданка

1. Пятрусь, беларускі пісьменнік, народжаны ў Крушынянах (1932-1996), 2. муж Евы, 3. паэзія, проза і драма, 4. працяглы жаласны стогн ад вялікага болю, 5. раздражняльнік, які выклікае алергію, 6. усходні струнны музычны інструмент грушападобнай формы, 7. пасудзіна для зачэрпвання вады з калодзежа, 8. адзінка электрычнага супраціўлення, 9. дзяржаўны рэжым у міжваеннай Польшчы, 10. вялікае возера каля Мядзела, 11. брат дачкі, 12. бацька Хама, 13. опера Вердзі, 14. рад пакаленняў ад аднаго продка, 15. горад у В'етнаме пры ўпадзенні ракі Ка ў мора, 16. напрыклад, Дунай, 17. пасля сакавіка, 18. выспа з Джакартай, 19. японскі горад на ўсход ад Осакі, 20. урачысты верш, 21. гукі, якія ўтвараюцца пры іканні, 22. музычная п'еса з рэфрэнам, 23. востры край сякучай прылады, 24. сусед Зямлі, 25. Вялікае Літоўскае.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — страфа Ларысы Геніюш.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.



Адказ на адгаданку з 26 нумара

Граф, мятла, прынц, атака, серб, пі, непагадзь, цырк, дзікун, каромысел, венік, Амерыка.

Рашэнне: **Мы распяты на цыферблаце гадзінніка.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Фота і тэкст: Ганна КАНДРАЦЮК

Простыя дадаткі да агіяграфіі бласлаўлёнага Папялушкі

Магчыма, у Акопы я паехала, каб спытаць пра салёныя рыжыкі! Такім менавіта сямейным прысмакам частуе гледача пастаноўшчык фільма „Popiełuszko". Падобныя прапановы застаўляюць думаць пра Міцкевічавыя двары тыпу Сапліцова, са шляхтай з вытанчаным кулінарным густам, для якой выправа ў лес збіраць рыжыкі — свайго роду рытуал і прамоцыя дваранскай кухні. Карэнныя жыхары Сакольшчыны — гэта вядома мне з асабістага досведу — нават не глянуць на падобныя *бэткі*. Тут у найбольшай цане і пашане (вядома, па-за баравіком) салёныя зялёнкі, далікатна прыпраўленыя алеем, перцам і цыбулькай. У роднай хаце бласлаўлёнага не чулі пра салёныя рыжыкі ды не чакалі ад жыцця такіх вытанчаных прысмакаў. Маё пытанне пра ўлюбёную страву ксяндза Ежы Паляушкі ягоная маці палічыла напыхлівым:

Маці Ежы Папялушкі

У Сухаволі пабачым адно памяткі з варшаўскай кватэры Ежы Папялушкі

Братанак бласлаўлёнага Ежы Павел Папялушка (злева) у размове са Зьміцерам Косціным

— Што было для ўсіх, тое трэба было есці, — адказала яна. — Навару буракоў, картоплі, пасядаюць усе за стол, з'ядуць, і пайшлі да работы...

Прысмак роднага дому ксяндза Папялушкі больш праўдзіва запамятаў Лех Валэнса. Для прэзідэнта запамятаўся вясковы жытні хлеб спечаны матуляй у печцы, які будучы бласлаўлёны прывозіў з хаты сябрам у якасці падарунка.

— Мамо, то скажыце яшчэ пра *placki ziemniaczane*, — уключыўся ў размову сын Станіслаў, які прыслухоўваўся нашай гутарацы. Апошні прысмак звыш іншых вынеслі сябры-клірыкі, якія прыязджалі з Варшавы ў Акопы разам з Ежы Папялушкам.

— А, гэта! — прыгадвае з усмешкай маці бласлаўлёнага. — Тыя яго калегі то, як прыедуць, дамагаліся ўсё *пляцкаў*. Простая рэч: сатрэш картоплю, дабавіш яйка, крышку мукі і пячэш на патэльні пакуль яны зарумяняцца і стануць хрупкімі. Напяку ім цэлую міску, а тыя хлопцы ядуць і хваляць, што такіх добрых яшчэ не елі...

— Бо ў нас на тыя *пляцкі*, — перш чым сказалі, мы аблізалі слінку на думку пра ўлюбёную страву беларусаў, — кажуць *аладкі* або *дранікі*.

— А ў нас — *галадзі!* — здзівілася Марыянна Папялушка.

У хаце бласлаўлёнага нам не прапанавалі «кавы ці гарбаты», як заведзена ў апошні час у нашых вёсках і хутарах, а проста пачаставалі, як калісь ў вёсцы і зараз у горадзе, вадзіцай:

— Такой халоднай, з крана, — захваліў яшчэ яе Станіслаў Папялушка і пажартаваў: — *бо самагонкі то я не маю!*

* * *

Калі я прапанавала зрабіць памятны здымак для Марыянны Папялушкі, якая прысела на канапе, засланай саматканай радзюжкай, Станіслаў хацеў прыбраць дзве падушкі ў звычайных навалачках, пакладзеныя адна на адну ў краю ложка.

— А навошта іх прыбіраць? — я паспрабавала спыніць гаспадара, каб не псаваў нашай радзімай этнаграфіі.

— *Ażeby ładniej było!*

— Ёсць так як павінна быць.

— Ну, то як хочаце...

Магчыма, дзеля гэтых падушак, думала я сабе ў глыбі душы, чалавек прыязджае ў падобныя месцы, каб думаць пра тыя непрыкметныя этнічныя спалучэнні між людзьмі і пра спосаб, у які ўплываюць яны на эмоцыі. Дзякуючы ім адчуваем пах роднага дому і тую *свойскасць*, якая мацнейшая за ўсе ідэалогіі. Такі ж ложак, прыкрыты радзюжкай і аздоблены дзвюма падушкамі, пакладзенымі адна на другой, пабачыла я нядаўна ў роднай хаце паэта Анатоля Сыса ў Гарошкаве. Мая маці таксама не ўяўляе, што можна іначай паслаць канапу-версальку. У хаце Папялушкаў я падумала, што гэтая сямейка, дзякуючы іх *простай мове*, без ніякіх праблем дагаварылася б са сваякамі паэта з Гомельшчыны. Няважна, што іх мясцовасці раздзяляюць семсот кіламетраў і дзяржаўная мяжа. Мабыць, пры першай сустрэчы яны б спыталі адзін аднаго: *ці летась у іх абрадзіла бульба* або *хто ў апошні час памёр у вёсцы*. Ніхто не здзіўляўся б хусткай на галаве ў матуль паэта ці ксяндза. Наадварот, без той хусткі яны не выклікалі б у нас даверу. Падобная камунікацыя ніколі не спрацавала б дзесьці ў глыбі Польшчы, напрыклад, у Познані ці ў Груйцу. Праўда, у Сухавольскай гміне людзі двухмоўныя і часта польская ды беларуская мова пераплятаюцца ў адным сказе. Тут таксама вызначылі сваю нацыянальнасць:

— Мы — палякі, — кажа на сваёй беларушчыне Станіслаў Папялушка. Падобна на тэму свядомасці і мовы выкажацца бурмістр Сухаволі Ежы Амельян і яго суседзі ў Малой Ятвезі. Сваю простую мову назавуць беларускай, хоць без рашучай упэўненасці, толькі ў адных Дамуратах.

* * *

Пасля візіту ў Акопы ўсё, што я ўяўляла да гэтай пары пра Ежы Папялушку (на аснове прачытанага і пабачанага ў фільме), перавярнулася дагары нагамі. У хаце, дзе нарадзіўся бласлаўлёны, па сённяшні дзень адчуваецца пазначанасць і штосьці як боль існавання. Гэтая нескладаная праўда відавочная простым вокам на доўгім, загружаным ламаччам панадворку. Ад занядбаных будынкаў тхнула бяссіллем, бездапаможнасцю.

— Я ўжо і сам не ведаю як з усім справіцца, — прызнаецца Станіслаў. — Як узімку заваліўся дах у стадолцы, так і цяпер ляжыць развалены...

— То чаму вам не памогуць палітыкі? — спыталі мы. — Яны ж пры кожнай нагодзе прэзентуюць вашу маці як нацыянальны сімвал...

— Палітыкі прыедуць, зробяць што ім трэба і паедуць, — махнуў рукой Станіслаў.

— А хто паставіў той помнік і каплічку ля вашай хаты? — пацікавіліся яшчэ мы.

— Камень я сам прыцягнуў з нашага поля, — кажа брат бласлаўлёнага, — а каплічку збудаваў мой цесць, з *пустакаў*, якія асталіся як будавалі стадолу.

01.08 — 07.08

(22.03. — 20.04.) Творчыя парывы і прываблівыя перспектывы, з другога боку — лішак няўпэўненасці, пераходзячая ў істэрыку цяга да прыгод. Шырокі жэст і прыгожыя паводзіны. Ды праблемы з грашыма будуць турбаваць нервы. Добры дзень: 1.08.

(21.04. — 21.05.) Асцерагайся далёкіх падарожжаў, асабліва за мяжу. У падарожжы будзь максімальна асцярожным. Зважай на законы і падазроныя рэчы. Многа рамантыкі. Добрыя дні: 2, 3, 4.08.

(22.05. — 22.06.) Эмацыянальны пад'ём. Можаш пачынаць жыццё з чыстага ліста. Вітаецца любая актыўнасць. Хоць рамантычны флеер развеецца, астануцца будні. Будзеш героем службовых плётак. Не абмяркоўвай сваіх планаў з іншымі. Добрыя дні: 1, 6.08., напружаны: 4.08.

(23.06. — 23.07.) Жнівень можа прынесці складанасці ў асабістым плане. Можаш перанесці лёсатворчы пераварот. Застануцца з табою сапраўды верныя людзі. Пазбягай праяў дэспатызму і нахабнасці ў адносінах да блізкіх людзей. У службовых справах лепш ацэньвай свае магчымасці; не ладзь інтарэсаў з сур'ёзнымі людзьмі, калі ты яшчэ да гэтага не гатовы. Добры дзень: 7.08., напружаны: 1.08.

(24.07. — 23.08.) Больш радасці і аптымізму. Творчы настрой. Самастойна ствараеш сваё шчасце! Добрыя перамены ва ўстаялым жыцці ў пары. Пасля кантралюй свой эмацыянальны стан (магчымыя фобіі, сумненні, чаканне благога); дыхай араматамі траў: мяты, рамонка. Добрыя дні: 1, 5.08., напружаныя: 3, 7.08.

(24.08. — 23.09.) Могуць здарыцца напружаныя дні ў асабістым жыцці. Можа апанаваць цябе жарсць, а дэспатычнасцю і ўладнасцю можаш папсаваць рамантычныя адносіны. Старайся дзейнічаць свядома. Лёгка ўсвойваецца інфармацыя. Добрыя дні: 2, 3, 4.08., напружаныя: 5, 6.08.

(24.09. — 23.10.) Добрыя падзеі ў асабістым жыцці і поспехі ў службовых справах. Выклікаеш увагу блізкіх і далёкіх людзей. Заўважаць цябе і запрапануюць падтрымку. У адпачынку будзеш аколены паклоннікамі. Добрыя пакупкі. Добрыя дні: 5, 6.08., напружаныя: 1, 7.08.

(24.10. — 22.11.) Высокі энергетычны патэнцыял дасць магчымасць здзейсніць старыя мары і магутныя планы. Ды працаваць прыйдзецца на краю сілы і магчымасці! Пазбягай лішняй рашучасці ў адносінах. Добры дзень: 7.08., напружаныя: 2, 3, 4.08.

(23.11. — 22.12.) Цэлы жнівень будзе пад знакам фінансавых поспехаў і няверных сяброў. Будзь асабліва асцярожным са сваімі грашыма (не насі большай касы і дарагіх аздоб). Апірышчам і падтрымкай будзе сям'я. Можаш шмат зарабіць, ды пры гэтым моцна старацца. Добры дзень: 1.08., напружаныя: 5, 6.08.

(23.12. — 20.01.) Больш часу прысвяці працы над памылкамі і на пасля адкладзі ініцыятыўныя дзеянні. Магчымы ўдалы працэс самаадукацыі. Не рэкамендуецца ў жніўні мяняць вонкавы выгляд. Не перагружайся фізічна. Добрыя дні:, 2, 3, 4.08., напружаныя: 6, 7.08.

(21.01. — 19.02.) Час разумнага эгаізму. Выбар, зроблены ў гэты жнівень, акажа вызначальны ўплыў на далейшае жыццё. Магчымыя страты. Усе справы даводзь да завяршэння. Добрыя дні: 1, 2, 6.08., напружаныя: 3, 7.08.

(20.02. — 21.03.) Разважнасць у справах прынясе ўдачу. Усё зробленае будзе аплачана каштоўнай манетай. Магчымыя перашкоды, ды іх пераадоленне таксама спрацуе табе на карысць. Не разлічвай на ўплывовых сяброў. Добры дзень: 7.08., напружаныя: 5, 6.08.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960